ПАЧЫНАЕМ ГЕНЭРАЛЬНЫ АГЛЯД

ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ, ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Кам уністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 289 (3887)
ПЯТНІЦА, 12 СЬНЕЖНЯ
1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзённа за выключэньнем чацьвяргоў

На спробы шкоднікаў, інтэрвэнтаў, контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў сарваць сацыялістычнае будаўніцтва—адкажам поўным выкананьнем гаспадарчых праграм, узмацненьнем пралетарскай абароназдольнасьці Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік

Выканаць і перавыканаць прамфінплян ударнага!

Генэральная лінія партыі на максымальныя тэмпы індустрыялізацыі краіны і сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі забясьпечыла вялізарнейшыя посьпехі ў народнай гаспадарцы Савецкага Саюзу.

З бальшавіцкай непрымірымасьцю вядучы змаганьне з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, мабілізуючы масы на перамаганьне труднасьцяй росту,—партыя прывяла краіну да трэцяга году пяцігодкі з балянсам вялізарных дасягненьняў на ўсіх рашаючых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Мінулы гаспадарчы год для БССР, як і для ўсяго Савецкага Саюзу, быў годам бялвых тэмпаў, годам перавыкананьня заданьняў пяцігодкі амаль па ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Мы ўступілі ў апошні месяц ударнага кварталу, які аддзяляе нас ад рашаючага году пяцігодкі. Гэты квартал зьяўляецца важнейшым зьвяном у змаганьні за будаўніцтва сацыялізму, у змаганьні за ператварэньне ў жыцьцё лёзунгу «Пяцігодка—за чатыры гады». На працягу ўсяго ўдарнага кварталу мы павінны ня толькі выканаць і перавыканаць самастойны прамфінплян, але адначасова пакрыць запазычанасьць, якая засталася па радзе галін прамысловасьці ад мінулага году. Толькі на аснове поўнага выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу могуць быць забясьпечаны яшчэ больш высокія тэмпы нашага разьвіцьця ў надыходзячым гаспадарчым годзе. Гаспадарча-палітычнае значэньне плянаў ударнага кварталу—вялізарнае і патрабуе, каб да іх выкананьня была прыкавана ўвага ўсяе партыі, усяе рабочае клясы.

Якое-ж становішча на фронце барацьбы за тэмпы ўдарнага кварталу? Трэба з усёй упэўненасьцю сказаць, што гэта становішча ў прамысловасьці БССР ЯУНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. У кастрычніку па цэлым радзе галін прамысловасьці прамфінплян ня выконваецца. Лістапад таксама ня прынёс патрэбнага перапому. Наадварот, рэспубліканская прамысловасьць у лістападзе працавала горш, чым у кастрычніку, даўшы зьніжэньне агульнай лічбы з 86,5 проц. да 83-85 проц.

Па асобных галінах становішча выглядзе так: металаапрацоўчая прамысловасьць у лістападзе дала вельмі значнае зьніжэньне выпуску прадукцыі: 61,5 замест 71,4 проц. у кастрычніку; папяровая прамысловасьць, якая ў кастрычніку выканала праграму на 94,1 проц. у лістападзе дае 84,3 проц.; запалкавая прамысловасьць дае зьніжэньні з 87,4 проц. у кастрычніку да 85,3 проц. у лістападзе; шэйная прамысловасьць засталася на адным месцы—89,2 проц.; шкляная прамысловасьць лістападаўскую праграму выканала на 94,7 проц., гарбарна-абутковая—90,4 проц.

Асаблівую трывогу выклікае слабое выкананьне якасных паказальнікаў і ў першую чаргу ў галіне зьніжэньня сабекошту. Тут на цэлым радзе прадпрыемстваў мае месца нават рост сабекошту прадукцыі. Напрыклад, гута «Камінтэрн» павялічыла сабекошт на 18,6 проц., фабрыка «Дняпроўская мануфактура», рымарная ў Магілеве, папяровая «Спартак»—павялічылі сабекошт кожная больш, чым на 7 проц., і г. д.

Гэтае трывожнае зьявішча павінна мабілізаваць сілы рабочае клясы таму, што як піша т. АРДЖАНІКІДЗЭ у сваём лісьце: «асаблівую важнасьць пры гэтым маюць заданьні па якасных паказальніках і мабілізацыя унутраных рэсурсаў, пасьпяховае выкананьне якіх абумоўлівае стварэньне укутраных накапленьняў, за лік якіх у значнай частцы робіцца фінансаваньне будаўнічай і вытворчай праграмы асобнага кварталу».

Аслабленьне ўвагі з боку раду партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый да пытаньняў барацьбы за прамфінплян, няўменьне мабілізаваць масы на выкананьне баявых задач асобнага кварталу, новы-старчальнае кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, арганізацыйныя нелады—усё гэта стварыла такое становішча, што пытаньне аб выкананьні прамфінпляну выклікае самую сур'ёзную трывогу.

Падобнае становішча далей абсалютна нецярпіма. Трэба ва што-б там ні стала дабіцца неадкладнага і крутога перапому, патрэбна сапраўдная мабілізацыя ўсіх сіл партарганізацыі, камсамолу, саветаў, прафсаюзаў, гаспадарчых органаў на ліквідацыю прарываў.

«ЗЬВЯЗДА» СУПОЛЬНА З ВСНГБ і ЦСПСБ ЗАРАЗ АРГАНІЗУЮЦЬ ГЕНЭРАЛЬНЫ АГЛЯД ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ І ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ДА НАДЫХОДЗЯЧАГА ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Гэта кампанія павінна ператварыцца ў сапраўдны БАЯВЫ ШТУРМ НАЯЎНЫХ ПРАРЫВАЎ, павінна паставіць на ногі ўсю пралетарскую грамадзкасьць, забясьпечыць ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ.

Практыка дзьвёх генэральных праверак, праведзеных «Зьвяздой» у часе веснавой сяўбы і асеньняй с.-г. кампаніі, навочна сьведчыць аб тым, што хутная перабудова работы на баявыя тэмпы, мабілізацыя ўсіх сіл і сродкаў можа забясьпечыць вялізарнейшыя рэзультаты, бясспрэчны эфэкт.

Сёньня мы паўтараем гэты вопыт, абвяшчаем генэральны агляд прамысловасьці.

Задачы агляду зусім выразныя і канкратныя: ён павінен даць 100 проц. выкананьня прамфінпляну, забясьпечыць нашу поўную гатоўнасьць да ўступленьня ў новы гаспадарчы год.

АГЛЯД ПАВІНЕН ПРАЙСЬЦІ ПАД ЗНАКАМ РЭАЛІЗАЦЫІ ВЕРАСЬНЁЎСКАЙ АДОЗВЫ ЦК УсеКП(б) і ПАСТАНОЎ АПОШНЯГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б. АДНАЧАСОВА ЁН ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА СУСТАЎНОЙ ЧАСТКАЙ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ НА ЛЕПШАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА.

Правядзеньне агляду, барацьбу за кожны процант выкананьня прамфінпляну неабходна шчыльнейшым спосабам УВЯЗВАЦЬ З ЗАДАЧАМІ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ, УМАЦАВАНЬНЯ МАТАР'ЯЛЬНАЙ БАЗЫ ПЯЦІГОДКІ. Той вялізарны працоўны ўздым, якім рабочая кляса адказала выкрытым шкоднікам, інтэрвэнтам, контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратам, якія імкнуліся абярнуць краіну Саветаў у калёнію сусьветнага імпэрыялізму,—гэты ўздым павінен быць накіраваны ў рэчышча штодзённай барацьбы за выкананьне гаспадарчых заданьняў, барацьбы за рэвалюцыйныя тэмпы работы.

Агляд можа прайсьці з посьпехам толькі тады, калі будзе забясьпечан актыўнейшы ўдзел у ім найшырэйшых мас рабочае клясы, калі ён будзе зьвязан з далейшым ростам і разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, калі ўсе партарганізацыі адразу-ж пабальшавіцку здолеюць арганізаваць ініцыятыву мас, павесьці іх на штурм прарываў. МАСАВАСЬЦЬ І ЎДАРНАСЬЦЬ—АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ АГЛЯДУ.

Адначасова трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць недапушчальнасьць непатрэбнай знадворнай параднасьці, падмены практычнай дзелавой работы споўнай шуміхай. Дні агляду трэба ператварыць ва ўпартую настойлівую барацьбу за выкананьне прамфінпляну, за адхіленьне арганізацыйных недадоў у рабоце заводзкіх арганізацый, за забясьпячэньне выкананьня прагрм надыходзячага гаспадарчага году.

Агляд павінен выкрыць усе недахопы ў рабоце нашых партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый. У той-жа час неабходна дабівацца ЎСЕБАКОВАГА ПАКАЗУ РАБОТЫ ПЕРАДАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ПЕРАНЯСЕНЬНЯ ІХ ВОПЫТУ НА ЎСЕ ФАБРЫКІ І ЗАВОДЫ.

Парадак правядзеньня агляду сёньня друкуецца ў «Зьвязьдзе». АГЛЯД ПРАВОДЗІЦЦА З 12 ПА 31 СЬНЕЖНЯ. У адрозьненьне ад мінулых праверак, зараз раённыя штабы не ствараюцца. Гэта, вядома, ні ў якой меры не зьмяншае адказнасьці раённых цэнтраў за кіраўніцтва праверачнымі брыгадамі, за ўсю работу.

Баявым правядзеньнем генэральнага агляду даб'ёмся ліквідацыі ўсіх прарываў у прамфінпляне, спатканым рашаючы год пяцігодкі ва ўсеўзбраеньні.

Мабілізуючы масы вакол бягучых лёзунгаў партыі, бязьпітасна выкрываючы правааапартуністычныя мінімалісцкія ўстаноўкі, даючы ім бязьлітасны адпор, вядучы рашучае змаганьне з «левымі» загібамі, мы ўпэўнена пойдзем да новых перамог, да новых дасягненьняў па шляху пабудовы сацыялізму.

Генэральны агляд правядзем пабаявому. Дружна за работу!

Прамфінплян ударнага кварталу павінен і будзе выкананы і перавыкананы!

Выкананьне фінансавага пляну асобнага кварталу—ПАД ГРАМАДЗКІ КОНТРОЛЬ

ПАСТАНОВА ЦКК УсеКП(б)—НК РСІ СССР АД 10 СЬНЕЖНЯ

МАСКВА. У матах выкананьня фінансавага пляну асобнага кварталу, ЦККНК РСІ запрапанаваў мясцовым кантрольным камісіям у якасьці важнейшай сваёй работы арганізаваць бесьперапынны нагляд за ходам выкананьня фінансавага пляну, важнейшай сустаўной часткай якога зьяўляецца мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, паскарэньне мабілізацыі таварных запасаў і паскарэньне прасоўваньня тавараў як з прадпрыемстваў у гандлёвую сетку, так і па каналах гандлёва-каапэрацыйнай сеткі да спажыўцоў. У ДАПАМОГУ МЯСЦОВЫМ РСІ ПАВІННЫ БЫЦЬ СТВОРАНЫ ЧАСОВЫЯ КАНТРОЛЬНЫЯ БРЫГАДЫ САДЗЕЙНАСЬЦІ ОРГАНАМ РСІ. Усклаасьці на часовыя кантрольныя брыгады кантроль і нагляд за своячасовым атрыманьнем прампрадпрыемствамі і складамі разнарадак на адпраўку тавараў, за своячасовасьцю выкананьня прампрадпрыемствамі і складамі атрыманых імі нарадаў па адпраўцы тавараў і за своячасовасьцю адпраўкі з тавараміі рахункаў і іншых дакумантаў, за своячасовай дастаўкай тавараў у магазыны, падрыхтоўкай іх да водпуску спажыўцу (папярэдняе разважэньне, распакоўка і г. д.) і пускам іх у продаж. Часовыя кантрольныя брыгады ствараюцца мясцовымі РСІ праз нізавыя прафсаюзныя і партыйныя ячэйкі і сэкцыі саветаў. Часовыя кантрольныя брыгады працуюць пад кіраўніцтвам РСІ і прафарганізацый і робяць справаздачы аб сваёй рабоце перад РайРСІ і выпучыўшымі іх арганізацыямі.

Адказнасьць за ўсю работу часовых кантрольных брыгад ускладаецца на выпучыўшыя іх арганізацыямі.

Былыя правадыры Грамады—Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Бурсэвіч і б. пасол беларускага клюбу „Змаганьне"—Грэцкі—у Менску

10-га сьнежня ў Менск прыбылі правадыры разгромленай у 1927 годзе польскім фашызмам 100-тысячнай беларускай Работніцка-Сялянскай Грамады, б. паслы польскага сойму — РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, МЯТЛА і сакратар Грамады БУРСЭВІЧ, якія засуджаны былі на многія гады катаргі і потым датэрмінова былі звольнены з турмы. Датэрміновае звальненьне б. правадыроў Грамады зьяўлялася манэўрам польскага фашызму з мэтаю абаламучваньня і дэзарыентацыі беларускіх працоўных мас.

У № 281 «Зьвязды» ад 2-га сьнежня была зьмешчана дэклярацыя гэтых б. паслоў-грамадаўцаў — Рак-Міхайлоўскага, Мятлы і Бурсэвіча, у якой яны з надзвычайнай яскравасьцю выкрылі ўсе махінацыі пілсудчыкаў — усе панскія штучкі, з мэтаю абаламучаньня працоўных беларускіх мас, каб зьбіць іх з рэвалюцыйнага шляху.

Акрамя б. кіраўнікоў Беларускай Сялянска-работніцкай Грамады прыехаў і б. пасол беларускага рабоча-сялянскаг клюбу «Змаганьня» — ГРЭЦКІ.

Прыехаўшыя б. паслы выступалі ўчора на мітынгах на многіх менскіх фабрыках і заводах.

Пралетарыят БССР поўнасьцю ўхваляе прыгавар Вярхоўнага суда

Штодня ў рэдакцыю «Зьвязды» з усіх канцоў БССР паступаюць лісты і рэзалюцыі з ухваламі працоўных прыгавару Вярхоўнага суда над шкоднікамі з «прампартыі».

Гэтыя рэзалюцыі паказваюць, што працэс глыбока ўскалыхнуў шырокія масы працоўных БССР, якія ў адказ на шкодніцтва і падрыхтоўку інтэрвэнцыі яшчэ машней згуртаваліся вакол сваёй ленінскай партыі для выкананьня пастаноў 16-га зьезду УсеКП(б).

Так, напэтыў заводу «Энэргія» горача вітае і поўнасьцю ўхваляе прыгавар Вярхоўнага суда над шкоднікамі — агентамі міжнароднага імпэрыялізму з «прампартыі».

Гэты прыгавар зьяўляецца ня клясавай помстай, а неабходнасьцю разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва.

Ухваляючы поўнасьцю прыгавар, рабочыя абяцаюць яшчэ больш узмацніць мерапрыемствы па сац. будаўніцтве, выканаць і перавыканаць прамфінплян ударнага кварталу, падрыхтавацца да новага гаспадарчага году так, каб выправіць усе тыя прарывы, якія нарабілі шкоднікі.

Рабочыя заяўляюць, што яны вялі і будуць весьці бязьлітасную барацьбу з усякімі апартуністамі, якія імкнуцца павярнуць Савецкі Саюз назад да капіталізму.

Служачыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал пастанавілі адпрацаваць адзін дзень у фонд абароны краіны.

**

Заслухаўшы інфармацыю аб прыгавары Вярхоўнага суда над шкоднікамі контр-рэвалюцыйнай арганізацыі — «прампартыі», агульны сход рабочых, служачых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводу «Камунар» поўнасьцю ўхваляе прыгавар пралетарскага суда і пастанову прэзыдыуму ЦВК СССР аб памілаваньні шкоднікаў, лічачы, што савецкая ўлада ня можа кіравацца пачуцьцём помсты, асабліва ў адносінах да абясшкоджаных і пакаяўшыхся злачынцаў.

Папраўка

У перадавым артыкуле ад 10 сьнежня 1930 г. «Савецкая Беларусь — фарпост Савецкага Саюзу» ўкралася прыкрая памылка. Напісана: «Мы набліжаемся да поўнай ліквідацыі як эканамічнай, так і ПАЛІТЫЧНАЙ няроўнасьці»... Трэба чытаць: «Мы набліжаемся да поўнай ліквідацыі эканамічнай няроўнасьці», БО ПАЛІТЫЧНУЮ НЯРОЎНАСЬЦЬ НАЦЫЯ ЛІКВІДАВАЛА КАНЧАТКОВА КА СТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ.

3-я СЭСІЯ ЦВК БССР

Вячэрняе пасяджэньне 10 сьнежня

Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1931 год

З дакладу старшыні СНК БССР тав. М. М. ГАЛАДЗЕДА

У пачатку свайго дакладу тав. Галадзед спыняецца на выніках другога году пяцігодкі.

Вынікі другога году пяцігодкі

— За мінулы гаспадарчы год, — гаворыць тав. Галадзед, — рабочая кляса БССР пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі дасягнула вялікіх посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Капітальнае будаўніцтва па рэспубліканскай прамысловасьці выканана за мінулы год у разьмеры 44 млн. руб. замест 38,4 млн., вызначаных пяцігадовым плянам.

Валавая прадукцыя прамысловасьці дасягнула 400 млн. руб. замест 323,5 млн. па пяцігодцы.

Павышэньне прадукцыйнасьці працы на пяцігодцы вызначалася ў разьмеры 18 проц., мы-ж у другім годзе ўжо дасягнулі 24 проц. Зьніжэньне сабекошту па пяцігодцы вызначалася ў разьмеры 6,3 проц., мы-ж ужо дабіліся 9,7 проц.

— Да канца пяцігодкі,—гаворыць далей тав. Галадзед, — мы меркавалі ліквідаваць беспрацоўе, частка таварышоў нават сумнявалася ў магчымасьці выкананьня гэтай задачы і на апошні год вызначала стабілізацыю беспрацоўя. На справе мы ў другім годзе пяцігодкі зусім ліквідавалі беспрацоўе. Замест праблемы барацьбы з беспрацоўем перад намі паўстала праблема арганізацыі рабочае сілы і ўцягненьня ў вытворчасьць новых вялізарных пластоў рабочых.

Параўноўваючы становішча ў нас і ў капіталістычных краінах, тав. Галадзед кажа:

— У капіталістычным сьвеце беспрацоўе расьце з надзвычайнай хуткасьцю, капіталістычная рацыяналізацыя і эканамічны крызіс выкідваюць на вуліцу новыя масы беспрацоўных. У краінах капіталу мы наглядаем працэс далейшага росту зьбядненьня мас, росту беспрацоўя.

У нас, у краіне пралетарыяту, мы бачым рост дабрабыту працоўных, уцягненьне мільёнаў у сацыялістычнае будаўніцтва.

Гэта ярка паказвае, якія бліскучыя пэрспэктывы адкрываюцца для сацыялістычнага будаўніцтва і як пагыбляецца працэс загніваньня капіталістычнага сьвету.

Далей тав. Галадзед падае яшчэ некалькі характэрных лічбаў, якія таксама сьведчаць аб далейшым росьце нашай гаспадаркі.

На бесьпрацоўнику па БССР пераведзена 71,3 проц. рабочых, ударніцтвам на 1 кастрычніка ахоплена больш 65 проц. рабочае клясы. 43,2 проц. рабочых пераведзены на 7-гадзінны рабочы дзень.

Гэтыя лічбы не патрабуюць камэнтараў, яны гаворыць самі за сябе, яны сьведчаць аб далейшым нячуваным росьце сацыялістычнага будаўніцтва.

Спыняючыся на разьвіцьці сельскае гаспадаркі, тав. Галадзед падкрэсьлівае, што пяцігадовы плян павышэньня валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі за два гады выканан намі ўжо ў разьмеры 50 проц. Асабліва паказальнай зьяўляецца роля аграмаджанага сэктару ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

Па валавой прадукцыі аграмаджаны сэктар ваймае 19,7 проц. з усёй прадукцыі гаспадаркі, па таварнай — 46,3 проц. Ураджайнасьць у саўгасах і калгасах на 22,1 проц. вышэйшая, чым у індывідуальных гаспадарках.

Паданыя лічбы лепш за ўсё пацьвярджаюць правільнасьць генэральнай лініі партыі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Гэтыя дасягненьні,—гаворыць дакладчык,— магчымы былі толькі дзякуючы упартай барацьбе з усімі варожымі намі клясамі, барацьбе за генэральную лінію партыі,—барацьбе з правымі апартуністамі і нацыянал-апартуністымі.

Параўнальна з кантрольнымі лічбамі на 1929-30 год мы маем невыкананьне па якасных паказальніках. Так, сабекошт прадукцыі зьніжан у разьмеры 8 проц. замест 11 проц., прадукцыйнасьць працы павысілася на 24 проц. замест вызначаных 35 проц.

Ва ўдарным квартале мы таксама няпоўнасьцю выконваем заданьне. Ёсьць прадпрыемствы, якія яшчэ не ліквідавалі сваёй запазычанасьці дзяржаве.

Трэці рашаючы год

Пераходзячы да кантрольных лічбаў на наступны год, тав. Галадзед падкрэсьлівае, што трэці год пяцігодкі зьяўляецца асабліва важным, бо будзе вырашаць генэральны лёзунг партыі — выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Прырост валавой прадукцыі па рэспубліканскай прамысловасьці ў трэцім годзе пяцігодкі вызначаны ў разьмеры 104 проц. параўнальна з 1930 годам. Колькасьць рабочых у рэспубліканскай прамысловасьці ў сярэднім узрасьце на 52,8 проц. і дасягне 65.000 чал. Прадукцыйнасьць працы павінна будзе павялічыцца параўнальна з мінулым годам на 30 проц., сабекошт павінен зьнізіцца на 10 проц. пры ўмове палепшэньня якасьці прадукцыі.

Капітальнае будаўніцтва па ўсіх галінах прамысловасьці будзе складаць 171 млн. руб. На электрыфікацыю вызначаецца капіт 18 млн. рублёў.

Спыняючыся на разьвіцьці сельскай гаспадаркі, тав. Галадзед паказвае наступныя характэрныя лічбы.

К канцу 1931 году колькасьць калектывізаваных гаспадарак па БССР дасягне 45 проц. агульнай колькасьці бядняцка-сераднякіх двароў. Пасеўная плошча будзе даведзена да 4 млн. гэкт., у тым ліку па ільне да 240 тыс. гэкт. і па бульбе — да 650 тыс. гэктараў. Пад падзямымі травамі павінна быць занята да 400 тыс. гэктараў.

Пагалоўе ўсяе скаціны ў пераводзе на буйную рагатую да вясны 1931 году павінна павялічыцца на 8 проц.

Дакладчык падкрэсьлівае, што кантрольныя лічбы на 1931 год пакуль што зьяўляюцца арыентовачнымі і ў некаторай частцы, магчыма, будуць зьменены.

Чарговыя гаспадарчыя задачы

Далей тав. Галадзед спыняецца на чарговых гаспадарчых задачах. Плян збожжазагатовак, ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду, да 1 сьнежня выкананы толькі ў разьмеры 70,5 проц. у той час, калі да 1 сьнежня мы павінны былі ўжо скончыць збожжазагатоўкі. Многія нашы арганізацыі недаацанілі палітычнага значэньня своечасовага сканчэньня збожжазагатовак.

БССР зьяўляецца адным з асноўных загатоўчых раёнаў па ільне, між тым, плян ільнаазагатовак выкананы ў разьмеры 4,6 проц.; па загатоўках канапель — у разьмеры 1,1 проц. Між тым, з канаплямі зьвязаны важнейшыя галіны народнае гаспадаркі. Невыкананьне загатовак канапель зьяўляецца ўдарам па нашых валютных рэсурсах.

Ня лепш справа з загатоўкай бульбы і гародніны.

Нарэшце, дакладчык спыняецца на выкананьні пляну мабілізацыі грашовых сродкаў ва ўдарным квартале, які пакуль што выкананы ў разьмеры 57,1 проц., а ўдарны квартал ужо канчаецца. Асабліва ганебнае становішча з выплатай сельска-гаспадарчага падатку, які ў гэтым годзе меншы, чым у мінулым.

Маруднасьць выплаты сельска-гаспадарчага падатку тав. Галадзед тлумачыць апартуністычнымі адносінамі да кулацтва з боку ралу нашых ніізавых работнікаў. Сьцьвярджаць сёньня, што «ў нашым раёне кулак ліквідаваны», г. зн. рабіць грубейшую палітычную памылку, г. зн. патураць нашым клясавым ворагам.

Невыкананьне фінпляну, — гаворыць тав. Галадзед,—гэта значыць несвоечасовая выплата зарплаты рабочым. Да і студзеня запазычанасьць па зарплаце павінна быць ва што-б там ні стала ліквідавана. Фінансавы плян ударнага кварталу павінен быць выкананы поўнасьцю. Гэта дырэктыва безапэляцыйная.

**

Раніцнае пасяджэньне 11 сьнежня было прысьвечана сканчэньню дакладу т. Галадзеда і пачатку спрэчак.

Эканамічны крызіс у капіталістычных краінах і спробы інтэрвэнцыі

У заключэньне свайго дакладу т. Галадзед спыніўся на эканамічным крызісе ў капіталістычных краінах, на контррэвалюцыйнай рабоце, якую вялі агенты інтэрвэнтаў і на клясавай барацьбе ўнутры БССР.

— Эканамічны крызіс у капіталістычных краінах, — кажа т. Галадзед, — прагрэсуе з кожным днём. Ніякім блёкам супроць Саветаў, ніякімі падрыхтоўкамі да інтэрвэнцыі імпэрыялістам ня ўдасца ліквідаваць гэты крызіс. Яго выраўніць толькі пралетарская рэвалюцыя. Выхад з крызісу — толькі ў рэвалюцыйным наўстаньні працоўных мас.

— Суд над «прампартыяй» скончаны, прыгавар пралетарскага суда вынесен. Але суд над Пуанкарэ, Брынам, над сусьветным фашызмам яшчэ працягваецца. Прыгавар сусьветнаму капіталізму ўжо блізкі, гэты прыгавар будзе канчатковым, ня будзе надлягаць ніякаму абскарджаньню. Гэты прыгавар будзе — ліквідацыя капіталізму ў корані.

Няхай толькі напрабуюць імпэрыялістычныя драпежнікі напасьці на пралетарскую бацькаўчыну, яны атрымаюць бязьлітасны рашучы адпор.

Беларускія нац.-дэмакраты—агенты інтэрвэнцыі

Пераходзячы да клясавай барацьбы ў БССР, т. Галадзед характарызуе дзейнасьць інтэлігенцкай нацыянал-дэмакратычнай контр-рэвалюцыйнай групы, выкрытай ДПУ Беларусі.

Адзінай мэтай нацыянал-дэмакратаў была рэстаўрацыя капіталізму ў БССР. Людзі, якія прыходзілі на сэсіі ЦВК БССР і кляліся ў адданасьці савецкай уладзе, ашуквалі апошнюю, трымалі камень за пазухай, каб у спрыяючы момант кінуць яго на галаву рабочае клясы.

Вы памятаеце, таварышы, выступленьне Некрашэвіча на мінулай сэсіі ЦВК. Ён упэўніваў нас усіх у тым, што поўнасьцю адданы сацыялістычнаму будаўніцтву. Мы яму верылі. А ў гэты час нацыянал-дэмакраты рыхтавалі інтэрвэнцыю супроць нашай краіны і ўжо разьмяркоўвалі паміж сабою міністэрскія партфэлі.

Некалькі прыкладаў шкодніцкай дзейнасьці нацыянал-дэмакратычнай групы на культурным фронце. Лёсік у сваёй граматыцы піша аб Савецкай Беларусі наступнае: «Апанавалі чэрці мясца сьвятое». Сэнс гэтых слоў зусім зразумелы і растлумачэньня не патрабуе. У слоўніку Байкова і Некрашэвіча слова «пралетарыят» заменена словамі «бядота», «убоства»; слова «пралетары» заменена словамі «бядак», «бабыль»; слова «беднота» — «галота», «злыдні» і г. д.

Калі ўзяць літаратуру, якую выдавала БДВ, дык можна сьмела сказаць, што каля 70 проц. яе трэба здаць у макулятуру. Вось канкрэтныя вынікі дзейнасьці нацыянал-дэмакратаў. Нацыянал-дэмакраты мелі сваіх людзей у Белардзяржвыдавецтве і праводзілі там сыстэматычную шкодніцкую работу.

Нацыянал - дэмакраты праявілі сябе і на эканамічным фронце. Працуючы ў НКЗ БССР нацыянал-дэмакрат Смоліч імкнуўся накіроўваць дзейнасьць камісарыяту на шлях разьвіцьця капіталістычных элемэнтаў вёскі, на шлях абароны кулака і г. д.

Нацыянал-дэмакратычныя школьнікі пусьцілі свае шчупальцы і на мясцох. У Расьнянскім раёне нядаўна выкрыта контр-рэвалюцыйная арганізацыя на чале з адным настаўнікам, якая заняцца падпалам калгасаў, забойствам актывістаў, актыўным тэрорам супроць лепшых нашых актывістаў.

На адным са сходаў пад кіраўніцтвам загадчыка расьнянскай сямігодкі Пука была ўнесена контр-рэвалюцыйная пранапова выдаліць камуністаў са сходу. Вось, таварышы, прыклад самай агіднай контр-рэвалюцыйнай работы, якая бароначатак ад Лёсікаў, Некрашэвічаў, Смоліча і інш.

Нацыянал-дэмакраты Некрашэвіч, Лёсік, Ластоўскі, Смоліч і г. д. — агенты імпэрыялістаў і інтэрвэнтаў, вораг дыктатуры пралетарыяту, скарыстоўваў наша давер'е для таго, каб падрыхтаваць фашысцкую інтэрвэнцыю, каб рэстаўраваць капіталізм у нашай краіне. Яны трымалі сувязь з польскімі фашыстамі, з Луцкевічамі і інш., трымалі сувязь з контр-рэвалюцыйным украінскім «СВУ» і разам з імі вялі сваю шкодніцкую работу.

Пралетарыят і працоўнае сялянства глыбока абураны контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю нацыянал-дэмакратаў і патрабуюць для іх суровага пакаранньня.

Але ёсьць спробы з боку вялікадзяржаўных, польскіх і яўрэйскіх шавіністаў выкарыстаць гэту справу ў сваіх інтарэсах. Знаходзяцца такія, якія гавораць, што савецкая ўлада... «ліквідуе ўсё беларускае». Гэтым спробам трэба даць рашучы, бязьлітасны адпор. Паказ барацьбы з контр-рэвалюцыяй, як імкненьне нібы «ліквідаваць усё беларускае», нельга інакш кваліфікаваць, як адкрытую контр-рэвалюцыю.

Мы павінны з карэньнямі выкарчаваць нацыянал-дэмакратызм і вялікадзяржаўны шавінізм, як найбольшай небясьпекай на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі іншых колераў, патрэбнасьць неаслабная работы па ўзмацненьні абароназдольнасьці нашай краіны і баяздольнасьці Чырвонай армії.

Заканчваючы сваю прамову, т. Чарвякоў заўважае:

— Таварышы! Пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва патрабуе, каб кіруючая роля камуністычнае партыі ва ўсім нашым жыцьці, працы, ва ўсіх нашых арганізацыях усё больш узмацнялася. Рабочая кляса і працоўныя масы БССР перамагаюць, дзякуючы настаяннаму кіраўніцтву з боку камуністычнае партыі, дзякуючы таму, што ўся практычная работа БССР гэта ёсьць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Вось з гэтае прычыны барацьба за генэральную лінію партыі, барацьба супроць усякіх ухілаў і ў першую чаргу супроць правага ўхілу, як найбольш небясьпечнага на даным этапе будаўніцтва, зьяўляецца нашай штодзённай абавязковай задачай.

Правы ўхіл—гэта ёсьць кулацкая агентура ў радох нашае партыі. Барацьба правых ухілістаў супроць генэральнай лініі партыі, супроць ленінскага ЦК—ёсьць працяг у радох партыі тэй барацьбы, якую вядуць контррэвалюцыйныя элемэнты і арганізацыі супроць дыктатуры пралетарыяту.

Ня менш рашуча мы павінны весьці барацьбу супроць нацыянал-апартуністаў, які зьяўляецца агентурай нац.-дэмакратызму ў партыі. З гэтае прычыны апошні пленум ЦК КП(б)Б абвясьціў погляды нацыянал-апартуністаў несумяшчальнымі з прабываньнем у радох нашае партыі.

Мы павінны дамагацца таго, каб нашы савецкія органы былі сапраўднымі органамі дыктатуры пралетарыяту, якія здольны з посьпехам вырашаць усе задачы сацбудаўніцтва.

Прамова тав. А. Г. ЧАРВЯКОВА

— 3-я сэсія ЦВК БССР пачынае работу на важным этапе сацыялістычнага будаўніцтва СССР. Рабочая кляса БССР, разам з рабочай клясай СССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, вядзе разгорнутае наступленьне па ўсім фронце, змагаецца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, заканчвае асобны квартал і рыхтуецца да трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Змагаючыся за ажыцьцяўленьне разгорнутай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, вызначанай XVI зьездам УсеКП(б), рабочая кляса БССР, апіраючыся на батрацка-бядняцкія і калгасныя масы вёскі, у саюзе з серадняком, атрымлівае ўсё новыя перамогі на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Чарвякоў далей спыняецца на посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва БССР, якія дасягнуты за час паміж 2-ой і 3-ай сэсіямі ў галіне індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, у справе ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Дзякуючы гэтым дасягненьням няўхільна паляпшаецца матар'яльнае і культурнае становішча рабочае клясы і ўсіх працоўных БССР. Усе гэтыя посьпехі дасягнуты рабочай клясай БССР на аснове настаяннай і цеснай сувязі БССР з іншымі савецкімі рэспублікамі, дзякуючы настаяннай і магутнай матар'яльнай, арганізацыйнай, культурнай і іншай дапамозе з боку СССР.

Сацыялістычнае наступленьне пралетарыяту адбываецца ва ўмовах надзвычай абвостранага клясавага змаганьня і складаных міжнароднай абстаноўкі. Яркім прыкладам гэтага можа служыць справа выкрытай і асуджанай пралетарскім судом контр-рэвалюцыйнай арганізацыі так званай «прамысловай партыі».

Даючы характарыстыку контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «прампартыі», тав. Чарвякоў спыняецца на выкрыцьці групы контр-рэвалюцыянэраў беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія здрадзілі высокаму давер'ю рабочае клясы і працоўных БССР і на працягу ўсяго часу свайго ўдзелу ў рабоце і жыцьці Савецкай Беларусі вялі контр-рэвалюцыйную, шкодніцкую работу, накіраваную на адваўленьне капіталізму ў БССР праз інтэрвэнцыю. Беларускія контр-рэвалюцыянэры—

Правыя і „левыя“ апартуністы—агентура варожае клясы, ідэйныя дапаможнікі інтэрвэнтаў

РАШУЧАЯ БАРАЦЬБА З АПАРТУНІЗМАМ У ТЭОРЫІ І НА ПРАКТЫЦЫ, ЯК ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ, З ФРАКЦЫЯНЭРАМІ З ПРАВА-„ЛЯВАЦКАГА“ БЛЕКУ, З НАЦЫЯНАЛ-АПАРТУНІСТАМІ; ПАВЫШЭНЬНЕ ІДЭЙНА-ТЭАРЫТЫЧНАГА УЗРОЎНЮ МАС—НЕАБХОДНАЯ УМОВА НОВЫХ ПЕРАМОГ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ

Вон з партыі кулацкіх агентаў

У ЧЫМ САКРЭТ?

У першы перыяд сёлетняй збожжазагатоўчай кампаніі калгасы Гомельскага раёну значна адставалі ад адзіпаасобнага сэктару ў выкананьні плянаў загатовак. У той час, калі адзіпаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі выконвалі пляны на 100-120 проц., калгасы заставаліся па ўзроўні толькі 20 проц. выкананьня. А ў агульнай складанасьці збожжазагатоўкі ў раёне праходзілі зусім слаба.

У чым-жа прычына такога зьявішча?

Аказваецца прычына «адставаньня» калгасаў у выкананьні плянаў збожжазагатовак заключалася ў апартуністычным разьмеркаваньні плянавага заданьня на раён паміж калгасамі і адзіпаасобным сэктарам. Былое кіраўніцтва сельскага пясковага раёну ў асобе КП(б)Б і РВК у давядзеньні пляна выканаўцы пайшлі па лініі найменшага супраціўленьня. Лічбы загатовак разьмеркавалі між калгасамі і адзіпаасобным сэктарам ня ў адпаведнасьці з іх удзельнай вагой: калгасам, якія абяднаюць толькі 10 проц. гаспадарак раёну, дано заданьне каля паловы раённага пляну.

Зразумела, што калгасы мелі лепшы ўраджай у параўнаньні з адзіпаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, што ад калектыўнай працы значна павялічыўся вытворчы эфэкт і рэнтабэльнасьць гаспадаркі, але каля 50 проц. плянавага заданьня па раёну, якія былі дов[illegible] да калгасаў, це адпавядалі ўдзельнай вазе іх сельскагаспадарчай вытворчасьці. Пляны загатовак паміж калгасным і індывідуальным сэктарамі былі разьмеркаваны неправарыянальна.

Замест рашучага націску на кулака ў справе выкананьня цьвёрдых заданьняў па загатоўках, замест шырокага разгортваньня работы па мабілізацыі бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне перад дяржавай абавязкаў па збожжазагатоўках, кіраўніцтва Гомельскага раёну нарашыла «выехаць на калгасах», прадстаўляючы ільготы кулаку. У гэтым сакрэт «адставаньня» калгасаў у справе збожжазагатовак.

Новы склад РК КП(б)Б унёс адпаведныя карэктывы ў давядзеньне пляну да выканаўцаў. Раённая партарганізацыя стала на правільны шлях у рабоце па загатоўках, але факты апартуністычнай практыкі з боку паасобных ячэек і загатоўцаў працягваюцца.

ІЛЬГОТЫ... КУЛАКУ

Яшчэ і да гэтага часу радам кулацкіх гаспадарак ня выконваюцца цьвёрдыя заданьні, а парт'ячэйкі, у раёне абслугоўваньня якіх маюцца такія факты, ня ўжываюць рашучых мер да злому кулацкага сабатажу ў загатоўках. **Царахаўская, Касьцюўская і Нававіцкая** парт. ячэйкі плины загатовак збожжа і бульбы не даводзілі свячасова да кулацкага двара. Апартуністычныя разважаньні паасобных камуністаў аб «пераальнасьці» плянаў загатовак не сустракалі рашучага адпору. Паасобныя кампэрацкіяныя работнікі праводзілі апартуністычную лінію, бралі пад абарону кулакоў, дапушчалі анты-серадняцкія перагібы, асабліва ў бульбазагатоўках.

ВЫЛАЗКА АПАРТУНІСТА ВІНІЦКАГА

Старшыня райсельспажывецкага таварыства — **Вініцкі** даны яму на лініі спажывецкай кампэрацыі нарад на загатоўку 100 тон бульбы ня выконваў да часу зьняцьця яго з работы. Гэты апартуніст сьвядома сабатаваў мерапрыемствы партыі на вёсцы доманструючы сваю нязгоду з генэральнай лініяй партыі, якраз у той час, калі правыя і «левыя» апартуністы двурушнікі, спекулюючы на труднасьцях нашага росту, адпавілі сваю атаку на партыю і актывізаваліся ў змаганьні супроць яе генэральнай лініі, аб'ектыўна выконваючы сацыяльны заказ клясавага ворага. Адначасова двурушнік **Вініцкі** ў гутарках з паасобнымі камуністамі прапагандаваў права-апартуністычныя погляды.

На пасяджэньні бюро РК па пытаньні бульбазагатовак Вініцкі адкрыта заявіў: «Пляну я ня выконваў і выконваць ня буду, таму, што нерэальнымі плянамі сьвядома ствараем труднасьці».

Апартуністам з правага і «левага» лягеру, якія апынуліся ў палоне кулацкай ідэалёгіі, не зразумець таго, што нашыя труднасьці зьяўляюцца труднасьці сацыялістычнага росту, што «адрозніваючая рыска нашых труднасьцяй заключаецца ў тым, што яны самі ствараюць базу для іх перамогі» (Сталін). Апартуністам, якія страцілі рэвалюцыйныя пэрспэктывы над ідэалёгічным уплывам варожых нам клясаў, няма справы да тых вялізарнейшых посьпехаў, якія дасягнуты партыяй ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Ім няма справы да таго, што ідэі партыі сталі ўласнасьцю многіх мільёнаў будаўнікоў сацыялізму.

І вось, кулацкі агент з партбілетам—Вініцкі на насяджэньні бюро РК наводзіць розныя паклёпы на партыю, выказваючы нязгоду з яе генэральнай лініяй, актыўна выступае ў абарону кулацтва.

Бюро Гомельскага РК з бальшавіцкай рашучасьцю дало адпор нахрэваму апартуністу і пастанавіла зьняць яго з кіруючай работы, ў райспажывецкім таварыстве, перадаўшы справу аб яго партыйнасьці ў РКК. Тады Вініцкі пачынае манэўраваць. Ён ужо «прызнае» памылковым сваё выступленьне і заяўляе аб згодзе праводзіць генэральную лінію партыі. Але двурушнікам, здрадлікам партыі ня можа быць даверя. Вініцкі, выказваючы жаданьне быць у партыі, працаваць разам з партыяй, між іншым, пратаварыўся ў заяве «я вельмі шкадую, што так рана выказаўся».

Бачыць, Вініцкі, як і ўсе апартуністы двурушнікі, выкрытыя перад партыяй і шырокімі беспартыйнымі працоўнымі масамі, як агентура клясавага ворага, шчэ спадзяюцца на свой «посьпех», чакаюць больш спрыяючага моманту для атакі на партыю.

Парт'ячэйка райкапсадсаюзу **выкінула з сваіх радоў Вініцкага.** На задачах узмацненьня барацьбы з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, асабліва правым апартунізмам, як найбольш небясьпечным, мабілізавана ўся раённая партарганізацыя. У адказ на вылазку апартуніста Вініцкага, раённая партарганізацыя ўзмацніла работу на загатоўках і дасягнула таго, што плины бульбазагатовак выкананы ў раёне з перавышэньнем.

ПАЛІТЫЧНАЯ ПАМЫЛКА ЯЧЭЙКІ

Трэба адзначыць, што ячэйка КП(б)Б райкапсадсаюзу, даўшы ў асноўным правільную ацэнку вылазцы апартуніста Вініцкага, па-бальшавіцку арабіўшы арганізацыйныя выводы ў адносінах да яго, дапусьціла грубую палітычную памылку ў кваліфікацыі пытаньня аб цэнах на прамтавары.

Гомельскі райком КП(б)Б павінен неадкладна скасаваць адпаведныя пункты пастановы сходу ячэйкі і правільна арыентаваць ячэйку ў пытаньні аб цэнах.

Я. Іа.

Агонь па прымірэнцах

КІРАЎНІЦТВА АСЬВЕЙСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ ДАЕ АДПОРУ ВЫЛАЗКАМ АПАРТУНІСТАЎ

Асноўнай умовай ажыцьцяўленьня гаспадарча-палітычных задач сацыялістычнага будаўніцтва, якія вызначаны апошнім пленумам ЦК КП(б)Б, зьяўляецца арганізацыя працоўных мас на выкананьне гэтых задач, бязьлітасная барацьба з правымі ухілам, як галоўнай небясьпекай, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх.

Гэтых задач не разумее кіраўніцтва Асьвейскай раённай партарганізацыі. Ды і ня толькі не разумее; бюро РК яравіла сябе нездольным праводзіць у жыцьцё дырэктывы партыі. Падамо некалькі канкрэтных фактаў.

Нядаўна на адным з пасяджэньняў бюро РК член бюро **Пракоф'еў** выступіў з права-апартуністычнай прамовай, у якой, між іншым, заявіў аб немагчымасьці на яго думку, разгортваць сацыяборніцтва ў калгасах. Да яго апартуністычных поглядаў далучылася большасьць складу бюро. Пасьля сыгналу ў газэце «Чырвоная Полаччына» аб правым ухіле ў кіраўніцтве Асьвейскай раённай партарганізацыі бюро РК «прызнала» сваёй памылкай, што не рэагавала на выступленьне Пракоф'ева, які выказваў права-апартуністычныя погляды і пастанавіла лічыць неабходным шырока абгаварыць выступленьне Пракофева на сходзе ячэйкі, заслухаўшы справаздачу яго аб рабоце Падырскай ячэйкі, у якой ён зьяўляецца сакратаром.

Гэта пастанова пастановаю і засталася. Кіраўніцтва не палічыла патрэбным выносіць апартуністычную вылазку Пракофе'ва ў партыйныя масы і паабальшавіцку асудзіць свае прымірэнцкія адносіны да праяў правага апартунізму.

Другі факт. Старшыня райкалгасасаюзу — **Жучкоў** (член бюро РК) у верасьні на пленуме РК выказваў апартуністычныя погляды аб «фэадальнай эксплёатацыі» тых сялян, якія знаходзяцца ў калгасах, аб нерэальнасьці даных калгасам плянаў па засеву ільну і г. д. **Ніхто з прысутных на бюро ня даў палітычнай ацэнкі гэтаму кулацкаму агенту.** Бюро РК аднеслася да апартуністычнага выступленьня яўна прымірэнча. На пасяджэньні бюро РК 18 лістапада Жучкоў зноў разьвівае сваю апартуністычную тэорыю, паклёпнічае на цэнтральныя кіруючыя органы і г. д. Нарэшце, Жучкоў сваю права-апартуністычную тэорыю, праўда, у некалькі больш асьцярожнай форме, разьвівае на сходзе раённай партарганізацыі па пытаньні вынікаў кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Калі тав. **Васэрман** выступіла і давяла радам фактаў сыстэму права-апартуністычных поглядаў Жучкова, дык апошні цынічна яе аблаяў, заявіўшы: «ты ня здольна разьбірацца ва ўхілах».

Як-жа рэагавала на гэта кіраўніцтва партарганізацыя? Як яна мабілізавала партыйныя масы на барацьбу з правым апартунізмам? **Ніяк! Усё тап-ж сыстэма прымірэнцтва!**

Сакратар РК — тав. Мэерзон, робячы даклад аб выніках кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б, не завастрыў перад арганізацыяй пытаньня барацьбы з правым ухілам, абышоў моўчкі меўшыя месца ў раённай арганізацыі апартуністычныя вылазкі. Па сутнасьці апартуністычных выступленьняў **Жучкова Мэерзон растлумачыў**, «што спачатку трэба праверыць работу Жучкова, а потым рабіць выводы».

Члены бюро РК, якія прысутнічалі на райпартсходзе, зараз імкнуцца замазаць апартуністычнае выступленьне Жучкова. Адзін з іх заяўляе, што ня чуў гэтых выступленьняў, другі кажа, што на гэты час выходзіў да тэлефону і г. д. Затое партыец **Кімаця** (адказны работнік РВК) пачаў пагражаць прыцягненьнем да адказнасьці тых, «хто шукае правага ўхілу ў раённым кіраўніцтве». Заявы тав. **Хаткевіча** аб тым, што Жучкоў адмаўляўся афармляць нанава арганізаваныя калгасы, таксама былі зазараны на віне кіраўніцтва сходу.

Кіраўніцтва-ж Асьвейскай раённай партарганізацыі піша рэзалюцыі аб барацьбе з правым апартунізмам, а на справе гэтай барацьбы не праводзіць.

Прысутны.

Ігнаруюць работу сярод беднаты

Асобныя парт'ячэйкі раду раёнаў, ня толькі не ўзмацнілі работы з беднатой, але наадварот, яе паслабілі. Некаторыя камуністы і парт'ячэйкі ў калгасах няправільна тлумачаць апошнія пастановы ЦК УсеКП(б) аб рабоце з беднатой, заяўляючы, што зараз у калгасах не павінны існаваць групы беднаты. Яны прыкрываюцца тым, што раз адзіпаасобнік увайшоў у калгас, дык ня трэба праводзіць сярод беднаты ніякай работы.

Падагуленыя матар'ялы ПА 70 ЯЧЭЙКАХ КП(б)Б аб рабоце з беднатой пацьвярджаюць, што 50 проц. гэтых ячэек на працягу апошніх 6 месяцаў амаль не вялі сярод беднаты ніякай работы.

Сакратар партыйнай ячэйкі калгасу «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН» разважае так: «з батрацтвам і беднатой асобнай работы ў калгасе праводзіць нельга, бо гэтым самым паслабляецца бядняцка-серадняцкі блёк» (?!). Гэтую «тэорыю» прапагандуе ня толькі сакратар ячэйкі, але і рад іншых партыйцаў.

Разам з гэтым, мы часамі наглядаем настрої і такога зьместу: на пленуме ТАЛАЧЫНСКАГА райкому выступіў з яўна апартуністычнай прамовай член партыі Вальчук. Ён кажа: «У нас па ўсім сельсавеце ўся работа праводзіцца здавальняюча, таму што мала беднаты. А з ёй вельмі цяжка працаваць». Вось разважаньні апартуністага. Яму лягчэй і ляпей працаваць там, дзе няма беднаты. Пленум ня даў рашучага адпору гэтаму, яўна кулацкаму выступленьню. Ёсьць і такія «мэтады» работы з беднатой. АЗАРЫЦКАЯ ЯЧЭЙКА дзеля таго, каб пазбавіцца гэтай работы, існуючыя групы беднаты пры калгасе, камітэта сялянскай дапамогі і сельсавеце аб'ядналa ў адну групу. Вядома, што пры такой пастаноўцы справы работу праводзіць нельга.

ПЯЦЯРЭНКА.

Там, дзе сьпіць ячэйка

Наколькі слаба разгорнута работа з беднатой у Лоеўскім раёне відаць з таго, што райком КП(б)Б тры разы за гэты год вызначаў нарады груп беднаты **але ні аднае з іх склікаць не ўдалося.** Ячэйкі ня маюць ніякага вучоту беднакоў і батракоў, не знаёмы з арганізацыйнай пабудовай груп беднаты і некаторыя з іх нават ня ведалі каго пасылаць на раённую нараду груп беднаты.

З тае прычыны, што многія ячэйкі ігнаравалі работу з беднатой, не абапіраліся на беднату ў правядзеньні гаспадарча - палітычных кампаній, таму апошнія ў раёне выконваюцца нездавальняюча. Апартуністычную бязьдзейнасьць раду ячэек у рабоце з беднатой выкарыстоўваюць кулацкія элементы вёскі ў сваіх варожых мэтах. У камісіі садзейнасьці правядзеньню розных відаў загатовак пралезьлі падкулачнікі і заможнікі, якія ў сваёй рабоце бяруць курс абараняць кулакоў і рабіць большы націск на беднату. Знаходзячыся ў камісіі садзейнасьці загатоўкам па Лоеўскім сельсавеце ,заможнікі **Карпенка** Іван і **Заяц** С. выкарысталі сваё становішча і замест здачы 100 пудоў бульбы здалі толькі па 30 пудоў, усклаўшы гэткую-ж колькасьць і на беднякоў. На скаргі беднаты аб скрыўленьні партыйнай лініі ў справе загатовак гэтыя падкулачнікі адказваюць:

— Зараз у нас кулакоў няма, мы ўсе роўныя, а таму і ўсякія загатоўкі ўсе павінны выконваць у аднолькавай колькасьці.

Далейшыя скаргі беднаты **аб давядзеньні да іх цьвёрдых заданьняў па бульбазагатоўках зэталіся бяз вынікаў.**

А. КАРПЕНКА.

Апартуністыя пасуюць

Задачы рэканструкцыйнага пэрыяду, якія ажыцьцяўляюцца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, патрабуюць узмацненьня кіраўніцтва з боку партыйных арганізацый пізавымі зьвеньнямі савецкага апарату ў вёсцы. Работа кожнага сельсавету на справаздачна-перавыбарчых сходах павінна адказваць выходзячы з таго, наколькі сельсавет справіўся з практычным ажыцьцяўленьнем задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Ачышчаючы сельсаветы ад кулацкіх элемэнтаў, замяняючы нядольных быць на чале сацыялістычнай перабудовы вёскі, адной з першачарговых задач у бягучай справаздачна-перавыбарчай кампаніі зьяўляецца павялічэньне ў новым складзе саветаў партыйнага ядра. Пры гэтым пры рэкамэндацыі кандыдатур у склад саветаў і павінны быць самыя ўважлівыя адносіны з боку партыйных ячэек у сэнсе праверкі працаздольнасьці на рабоце таго ці іншага камуністага, яго ненахіснасьці ў практычнай рабоце па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі. Факты скажэньняў клясавай лініі ў рабоце паасобных сельсаветаў, моманты праваапартуністычнай практыкі некаторых партыйцаў, якія працуюць у складзе сельсаветаў, патрабуюць завастрэньня ўвагі на гэтым пытаньні.

Між тым, прыходзіцца сустракацца з такімі фактамі, калі паасобныя камуністы праўляюць імкненьні ўхіліцца ад работы ў сельсавеце, апартуністычна пасуючы перад труднасьцямі работы ў цяперашніх вясковых умовах.

Паводле пастановы **Барысаўскага РВК** распушчан прэзыдыум Няхлюдаўскага сельсавету за грубае скажэньне клясавай лініі ў рабоце па збожжазагатоўках, якое заключалася ў аслабленьні націску на кулака і ігнараваньні работы з беднатой. Рэкамэндаваны ў склад сельсавету на кіруючую работу сакратар ячэйкі **Мініцкі** наадрэз адмовіўся працаваць у сельсавеце, заявіўшы: «На работу ў сельсавет, які зьяўляецца першым этапам да турмы, ні за што не пайду».

Другі апартуністы **Цітеў**, які ў апошні час зьяўляўся сакратаром ячэйкі і сакратаром райсавету Асоавіяхіму, таксама катэгарычна заявіў аб нежаданьні працаваць у сельсавеце «таму, што пасылка на пасаду старшыні сельсавету не зьяўляецца для яго вылучэньнем». Цітоў выключаны райкомам з партыі і зьняты з работы ў райсавеце Асоавіяхіму. Справа аб Мініцкім перадана ў РКК на прадмет вырашэньня яго далейшага прабываньня ў радох партыі.

Партарганізацыі павінны жорстка біць па апартуністых, якія на словах —за генэральную лінію партыі, а на справе ўхіляюцца ад яе правядзеньня.

Барысаўскі.

Вытворчая парт'ячэйка павінна:

„усю работу будаваць так, каб партарганізацыя ўвесь час была павернута тварам да вытворчасьці, тварам да цэху, тварам да выкананьня тых баявых задач, якія перад намі пастаўлены ўсёй палітыкай і генэральнай лініяй нашай партыі“ (Кагановіч).

РЭЙД „ПРАВДЫ“ і „ЗЬВЯЗДЫ“

ЦО „ПРАВДА“ І „ЗЬВЯЗДА“ ПРАВЯЛІ РЭЙД НА БУЙНЕЙШЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ МЕНСКУ З МЭТАЙ АЗНАЯМЛЕНЬНЯ СА СТАНАМ ПАРТРАБОТЫ НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ. НІЖЭЙ МЫ ДРУКУЕМ ПЕРШЫЯ МАТАР'ЯЛЫ РЭЙДУ

„На Кастрычніку“

Партыйная арганізацыя ф-кі «Кастрычнік» павярнулася «тварам да вытворчасьці», усю сваю практычную работу падначаліла задачам барацьбы за выкананьне прамфінпляну. Дзякуючы гэтаму быў своечасова ліквідаваны верасьнёўскі прарыў, які меў месца на фабрыцы, і да канца гаспадарчага году фабрыка выпла з перавыкананьнем гадавога заданьня (прамфінплян выкананы на 102 проц.). Партыйная арганізацыя дабілася вялікіх посьпехаў ня толькі ў справе колькасных, але і якасных паказальнікаў.

Работа на прапрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну на асобны квартал была разгорнута вельмі шырока. У справу абгаварэньня прамфінпляну былі ўцягнуты масы рабочых. Актыўнасьць партыйных мас і беспартыйных рабочых, будучы накіраванай на змаганьне за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, дала магчымасьць ускрыць апартуністычную практыку Белшвэйтрэсту, які браў курс на мінімальныя плины.

Вязумоўна, у рабоце партыйнага калектыву «Кастрычніка» ёсьць і недахопы. Да іх трэба аднесьці тое, што бюро парткалектыву не правярае як камуністы і камсамольцы-ударнікі выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы. Кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам пастаўлена яшчэ слабавата. Не вядзецца работы сярод ударнікаў, ня ўлічваюцца далатлія паказальнікі работы асобных брыгад.

Не ахоплена належным кіраўніцтвам з боку бюро калектыву работа прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. На працягу апошніх трох м-цаў на бюро калектыву ні разу не абгаворвалася пытаньне аб іх рабоце.

Па матар'ялах бюро калектыву відаць, што кіраўніцтва работай фабкому адсутнічае. Канкрэтных дырэктыў фракцыя фабкому па важнейшым момантах работы на фабрыцы не атрымлівала.

Партыйны калектыў не вядзе сыстэматычнай работы па выхаваньні шырокіх мас рабочых, па вярбоўцы лепшых ударнікаў у рады партыі. Паводле слоў сакратара, у сьнежані паступіла 50 заяў аб уступленьні ў партыю. Гэта ўжо гаворыць аб тым, што ў данай справе ўсё яшчэ пануе кампаніяйшчына.

І горш за ўсё тое, што ў парткалектыве не правяраецца выкананьне сваіх-жа ўласных пастаноў.

Нарэшце, неабходна паказаць на такі момант, што работа сярод жанчын не разгорнута. Выбары дэлегатак праводзіліся насьпех і фармальна. Склад дэлегатак зацьвярджаўся не на сходзе, а на мітынгу, які быў склікан на пытаньні аб арганізацыі Кастрычніцкай дэманстрацыі.

Усе гэтыя факты патрабуюць, каб партыйны калектыў, не аслабляючы змаганьня за выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу, больш увагі аддаў часавай рабоце і кіраўніцтву прафсаюзнай арганізацыяй.

Брыгада: РАЛЬКО, АПЭНГЭЙМ.

На „Энэргіі“

Парткалектыў заводу «Энэргія» ў асноўным перабудаваў сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі, якія былі высунуты ЦК УсеКП(б) у адозьве ад 3 верасьня. У выніку гэтай работы пашыраюцца сацыялістычныя мэтады працы на прадпрыемстве. Лік ударнікаў павялічыўся з 50 да 65 проц. усяго складу рабочых заводу. На заводзе існуе 20 ударных брыгад, 3 «сквозныя» брыгады, 12 вытворчых камун, прычым 4 камуны арганізаваны нядаўна.

Партыйны і камсамольскі склад заводу ў асноўным увесь ахоплен ударніцтвам. Аднак, бываюць выпадкі, калі з боку паасобных камуністаў і найчасьцей камсамольцаў парушаецца працоўная дысцыпліна. Партыйная арганізацыя, а таксама і камсамольская, яшчэ да гэтага часу не забясьпечылі цьвёрдай працоўнай дысцыпліны сярод усяго свайго складу.

Кантрольная лічба прадукцыі заводу на асобны ўдарны квартал была вызначана ў 1 млн. 200 тыс. рублёў. Рабочым заводу на сустрэчным пляне павялічылі заданьне на 6,3 проц. Прамфінплян за лістапад месяц выкананы толькі на 96,88 проц., хаця на асобных відах прадукцыі плян перавыкананы.

Буйнейшым недахопам на заводзе зьяўляецца павялічэньне браку. Калі брак за 1929-30 г. на заводзе складаў 10,15 проц., дык за кастрычнік м-ц ударнага кварталу выпушчана бракоўнай прадукцыі 10,40 проц., а за лістапад — 10,54 проц.

Трыкутнік заводу ня вдолеў яшчэ мабілізаваць масы на ліквідацыю гэтага буйнейшага прарыву. Практыка мэханічнага цэху, які правёў вялікую работу па барацьбе з бракам і дабіўся посьпеху ў зьніжэньні браку, паказвае, што пры належнай увазе з боку партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі і адміністрацыі можна ў параўнальна кароткі час дабіцца зьніжэньня гэтага адмоўнага зьявішча.

Работа вытворчых нарад яшчэ не перабудавана па-новаму. Нізавыя вытворчыя нарады не працуюць. Праводзяцца толькі агульна-заводзкія вытворчыя канфэрэнцыі і вытворчыя нарады брыгад.

Наколькі ўзрасла вытворчая актыўнасьць і ініцыятыва рабочых заводу відаць з таго, што з мая па лістапад месяц г. г. паданы рабочымі 292 прапановы. З іх толькі 56 адхілена, а рэшта прыняты і многія ўжо праведзены ў жыцьцё. Процант прынятых рабочых прапаноў паступова павялічваецца. Побач з гэтымі далатнымі фактамі былі выпадкі, калі майстры гаварылі рабочым, што іх прапановы ня будуць прыняты, а потым праз месяц-два самі выстаўлялі гэтыя прапановы і атрымоўвалі за іх прэміі (майстра Піатух). На жаль гэты ганебнейшы факт ня сустрэў належнага адпору з боку заводзкіх арганізацый.

Вялікую ролю ў справе мабілізацыі мас на змаганьне за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну адыгрывае заводзкая пматтыражка «Чырвоны молат». Але трэба прызнаць, што кіраўніцтва з боку бюро парткалектыву гэтай газэтай таксама, як і насьценнымі, газэтамі, невыстарчальнае. З гэтай прычыны газэта «Чырвоны молат» дапусьціла рад грубейшых палітычных памылак. Насьценныя газэты не асьвятляюць, як належыць, галоўнейшых пытаньняў жыцьця і працы заводу.

Важнай задачай зьяўляецца кваліфікацыя і перакваліфікацыя рабочых, у якіх завод адчувае вялікую патрэбу. У гэтай справе вялікую ролю павінна адыграць заводзкая тэхшкола. Аднак, рабоце гэтай школы не аддана патрэбная ўвага з боку заводакіраўніцтва. У школу запісалася 170 чалавек, а наведваюць яе ня больш 30-40 чал.

Парткалектыў заводу «Энэргія» павінен напружыць усе сілы на мабілізацыю рабочых для ліквідацыі тых буйных недахопаў, якія яшчэ ёсьць у рабоце на прадпрыемствах.

Брыгада: БАРОДЗІЧ і ГУЛІДА.

Па-бальшавіцку перабудаваць работу

Сакратар парт'ячэйкі **шчотачнай фабрыкі імя Крупскай** (Менск) тав. **Даніловіч** ня ведае, хто з камуністаў лепшы ўдарнік. Ён прызнаецца, што «лепшых прыкладных у нас на фабрыцы наогул няма», ён даводзіць, што на фабрыцы няма рабочага актыву. Ці так гэта?

Аб гэтым можна даведацца і ўпэўніцца толькі тады, калі пабываеш на фабрыцы, пагутарыш з рабочымі.

Цьверджаньні сакратара аб адсутнасьці актыву сярод рабочых у корані няправільныя. На фабрыцы ёсьць рад рабочых, якія зьяўляюцца прыкладнымі на вытворчасьці. Напрыклад, тав. **Савінкова**, сьлесар-пілаточ, яна выконвае тую работу, на якой раней сталі з чалавекі. З работай спраўляецца і паваг падрыхтоўвае да працы вучня. **Гольдбэрг**—лепшая ўдарніца на фабрыцы. Працуе 12 год на вытворчасьці, нядаўна падала заяву аб уступленьні ў партыю. **Вушакова, Каляда, Ткач** — прыкладныя работніцы на вытворчасьці, актыўна вядуць грамадзкую работу. Такіх работніц на фабрыцы шмат і, на вялікі жаль, іх ня бачыць партыйнае кіраўніцтва, ня згуртоўвае іх вакол асноўных задач партыі, не разгортвае сярод іх глыбокай палітычна-выхаваўчай работы.

Яшчэ горш стаіць справа з разгортваньнем культурна-масавай работы сярод тых рабочых, якія толькі прыбываюць на фабрыку. Партыйнае кіраўніцтва нават ня думае аб разгортваньні сярод групы новых рабочых якой-бы там ні было працы.

На фабрыцы на сёнешні дзень 737 рабочых, з іх пераважная большасьць — жанчыны. Партыйная праслойка зусім малая: усяго 50 чалавек членаў і кандыдатаў партыі. Расьце ячэйка слаба. Гэта зноў-такі вынік дрэннай работы партыйнай арганізацыі ў масах.

За лік камсамольцаў парт'ячэйка вырасла толькі на 3 асобы. Да рэчы, тут неабходна падкрэсьліць тое, што парт'ячэйка кіруе камсамольскай арганізацыяй вельмі дрэнна. Пэўная частка камсамольцаў ня толькі не зьяўляецца ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, а наадварот, ра[illegible]самольцаў падрываюць работу на вытворчасьці. Наконт камсамольцаў, а іх на фабрыцы 120 чалавек, старыя рабочыя кажуць:

— Камсамольца ў цэху вельмі цяжка адрозніць ад адсталага рабочага.

Зразумела, няправільным будзе лічыць што ўсе камсамольцы зьяўляюцца дрэннымі рабочымі. Аднак, нельга моўчкі абыйсьці той факт, што на фабрыцы мела месца апартуністычная вылазка з боку 6-ці камсамольцаў. Яна заключалася ў лозунгу сказаць камсамольцаў, завербаваў па рабочых, якія падпісалі заяву яўна рэакцыя тарамі ў яе складаньні былі камсамольцы **Гантман, Давыдаў, Зінеўскі, Ялентух, Савялевіч і Рычкоўскі.**

На гэтым канкрэтным факце апартуністычная вылазка як партыйная, так і камсамольская арганізацыі павінны былі мабілізаваць шырокія масы партыйцаў, камсамольцаў і рабочых, павінны былі даць бязьлітасны адпор вылазцы кулацкай агентуры. Бюро камсамольскага калектыву абмежавалася толькі тым, што паасобныя з гэтай шасьцёркі дало вымову.

На фабрыцы мелі месца праявы апатысэмітызму і шавінізму іншых колераў. Аднак, партыйная арганізацыя рашучага адпору ім не давала.

Дрэнна ажыцьцяўляецца ў практычнай рабоце і нацыянальная палітыка партыі і яе сустаўная частка беларусізацыя. Сама парт'ячэйка вядзе работу на беларускай мове, але заводакіраўніцтва яшчэ не беларусізавалася і ўсю сваю работу вядзе выключна на расійскай мове.

Вытворчая праграма на 22 лістапада была выканана на 113,5 проц. Як гэта здарылася, што там, дзе самарыцтыка не разгорнута, прапановы рабочых ня выконваюцца, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва існуе толькі фармальна, ударныя брыгады ў рынку адсутнасьці кіраўніцтва, разваліліся — прамфінплян перавыкананасьца?

У чым справа? Дзе прычына?

Не знайсьці ня цяжка. Белшчаціны складаючы кантрольныя лічбы на асобны квартал, паставіла сваёй задачай склаць такі плян, які лёгка можна перавыканаць. **Лічбы на ўдарны квартал былі яўна пераменшаны.** Адміністрацыя фабрыкі гэта ведала і дадала 16,5 проц. павялічэньня. Але і гэта аказалася ня тым, што патрэбна і што можна выканаць. Кантрольныя лічбы Белшчаціны, павялічаныя адміністрацыяй фабрыкі на 16,5 проц., абмяркоўваліся на бюро партыйнай ячэйкі, якое з імі згадзілася. Ды інакш і быць не магло—бюро ячэйкі складалася выключна з работнікаў адміністрацыі, ня было ні аднаго рабочага. Фабком таксама з лічбамі згадзіўся. Пачалі абмяркоўваць на сходах рабочых. Рабочыя далі сустрэчны плян, павялічаны на 2,5 проц. Вось чаму на сёнешні дзень ня недапушчальнай пастаноўцы работы ў цэху лічбы Белшчаціны перавыкананы.

Работніцы шліфоўшчыцы заяўляюць так: «Калі-б выканалі нашы прапановы, мы-б гэты плян выканалі куды з большым перавышэньнем».

Мы лічым, што Кастрычніцкі райком КП(б)Б зацікавіцца станам партыйнай работы на шчотачнай фабрыцы і прыме адпаведныя меры для таго, каб там пабальшавіцку перабудаваць і разгарнуць работу партыйнай і камсамольскай арганізацыі, каб яе наблізіць да цэхаў, да мас рабочых.

А. СВАБОДНЫ.

Біць па апартуністычнай недаацэнцы тэарытычнай вучобы

Папярэдзіць зрыў кампляктаваньня завочнакурсавога сэктару Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя Леніна

Разгорнутае нерамоснае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце высоўвае пытаньне аб неабходнасьці ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай кадраў партыйных работнікаў. Пастановаю ЦК УсеКП(б) ад 16 кастрычніка 1930 году было прапавана «пры ўсіх камвузах і паступова пры ўсіх саўпартшколах стварыць завочна-курсавыя сэктары з неабходнымі кадрамі рэцэнзэнтаў і кансультантаў. Адначасова з гэтым разгарнуць пры парткомах фабрычна-заводзкіх, саўгасных і калгасных ячэйках сетку гурткоў завочнікаў, для кіраўніцтва якімі выпучыць кваліфікаваных прапагандыстаў».

Як-жа ажыцьцяўляюцца гэта пастанова на мясцох на працягу таго пэрыяду, які прайшоў з часу даных дырэктыў.

Для таго, каб вырашыць справу падрыхтоўкі партыйных кадраў, існаваўшы ў Беларусі завочны камуністычны унівэрсытэт, рэарганізаваны ў гэтым годзе ў завочна-курсавы сэктар камвузу імя Леніна, з аднолькавымі, што і на дзённым камвузе, аддзяленьнямі. Апрача гэтага, пры іх арганізавана яшчэ аддзяленьне дакамвузаўскай падрыхтоўкі і прадметнага навучаньня.

З 1 кастрычніка пачалося кампляктаваньне ўсіх аддзяленьняў завочна-курсавога сэктару, але, ня гледзячы на тое, што канчатковы тэрмін кампляктаваньня быў вызначаны на 1 лістапада, яно да гэтага часу яшчэ ня скончана.

Склад камандыруемых на завочнае навучаньне ня зусім здавальняючы, як з боку партыйнага стажу, так і з боку вопыту ў кіруючай грамадзка-палітычнай рабоце. Сярод камандыраваных большасьць таварышоў, якія ўступілі ў партыю ў 1926-27 г.г., прычым, амаль зусім адсутнічаюць жанчыны. Таксама ніякі процант партыйных функцыянэраў (сакратароў парткалектываў, жаноргаў, загалчыкаў сэктараў і г. д.).

Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб выдучэньні на дакамвузаўскую падрыхтоўку 555 чал. выканана толькі на 37 проц. Такое недавыкананьне разьвёрсткі ЦК на дакамвузаўскую падрыхтоўку і нездавальняючы якасны склад дакамвузьнікаў у значнай ступені зьяўляецца вынікам нядбайных адносін паасобных раённых партыйных арганізацый да пытаньняў партвучобы.

Праведзенае камвузам Беларусі ў лістападзе абсьледаваньне на 10 раёнах выявіла рад абураючых зьявішч у справе арганізацыі завочнае вучобы. Амаль ва ўсіх абсьледаваных раёнах былі заявы з боку кіраўнікоў партыйных арганізацый, што «растлумачальную работу па пытаньні вучобы няма калі весьці,

ПРЫСТУПАМ УЗЯЦЬ ПРАМФІНПЛЯН УДАРНАГА!

РУЙНУЮЧЫ АДПОР НЕЦІКАМ З ПРАВАГА ЛЯГЕРУ!

Фабрыкі і заводы, станавецеся ў баявыя калёны ўдарнікаў, уключайцеся ў генэральны агляд прамысловасьці,

дакажэце рэвалюцыйныя тэмпы работы, змагайцеся за датэрміновае выкананьне плянавых заданьняў!

Хто будзе першым!

Праграма агляду

ЗАДАЧЫ АГЛЯДУ

1. Агляд мае сваёй асноўнай мэтай праверку выкананьня прамысловасьцю вытворчых праграм ударнага кварталу, пакрыцьця запазычанасьці па 2-м годзе пяцігодкі і падрыхтаванасьці прадпрыемстваў да ўступленьня ў новы гаспадарчы год.

2. Агляд павінен прайсьці пад знакам рэалізацыі верасьнёўскай адозвы ЦК УсеКП(б) і пастаноў апошняга пленуму ЦК КП(б)Б. Адначасова ён павінен зьявіцца сустаўной часткай усесаюзнага конкурсу на лепшае прадпрыемства.

Агляд па ўсім сваім працягу павінен зьявіцца днямі ўпартай, дзелавой работы па ліквідацыі прарываў, забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ударнага кварталу, на аснове новага ўздыму ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Агляд павінен прайсьці пад лёзунгам узмацненьня абароназдольнасьці краіны і эканамічнай незалежнасьці СССР, як адказ інтэрвентам і контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратам, якія імкнуліся абярнуць Саветкі Саюз і БССР у калёнію сусьветнага імпэрыялізму.

3. Канкрэтнай задачай агляду зьяўляецца:

а) Выявіць, як партыйныя, камсамольскія, прафесыянальныя, гаспадарчыя і адміністрацыйна - тэхнічныя арганізацыі выконваюць дырэктывы партыі ў барацьбе за прамфінплян ударнага кварталу, становішча з выкананьнем прамфінпляну на паасобных прадпрыемствах, у чым заключаюцца канкрэтныя прычыны прарываў у рабоце і якія мерапрыемствы патрэбны для таго, каб гэтыя прарывы ліквідаваць.

б) Паказаць якімі спосабамі і мэтадамі перадавыя прадпрыемствы забясьпечылі пасьпяховае выкананьне пляну, каб зрабіць іх вопыт упаснасьцю ўсіх фабрык і заводаў. Асабліва важна тут паказаць мэтады кіраўніцтва ўдарніцтвам з боку партыйных і прафесыянальных арганізацый;

в) Выявіць, наколькі прадпрыемствы падрыхтаваны да ўступленьня ў новы гаспадарчы год, як аб'яднаньні і ВСНГБ віруюць прадпрыемствамі і дапамагаюць ім у выкананьні прамфінпляну.

Агляд павінен быць цесна зьвязан з бягучымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі—перазаключэньнем калдагавара ў, перапыдарамі саветаў, мабілізацыяй фінансовых сродкаў і г. д.

АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АГЛЯДУ

4. Для правядзеньня агляду са дня яго абвяшчэньня на працягу адных сутак на ўсіх фабрыках і заводах БССР арганізоўваюцца спэцыяльныя брыгады па агульнаазаводзкія, так і ў кожным цэху. Агульнаазаводзкія брыгады ствараюцца пад старшынствам сакратара партыйнага калектыву ў складзе прадстаўнікоў камсамольскай арганізацыі, адміністрацыі, фабкому і некалькіх лепшых ударнікаў прадпрыемства. Цэхавыя брыгады ствараюцца паводле такога ж прынцыпу.

5. Кіраўніцтва брыгадамі ўскладаецца на РК КП(б)Б.

6. У агляд павінны зараз-жа ўключыцца ўсе цэнтральныя і раённыя раёнкі, якія знаходзяцца ў цяперашні момант на прадпрыемствах, у камандзіроўках на лініі ВСНГБ, ЦСПСБ, аб'яднаньняў.

7. Праверачныя брыгады абавязаны:

а) Адразу-жа пасьля абвяшчэньня агляду арганізаваць на прадпрыемствах сходы і мітынгі, на якіх паставіць даклады аб становішчы і канкрэтных задачах прадпрыемства ў сувязі з аглядам. На гэтых-жа сходах павінны быць вылучаны канкрэтныя пляны правяраньня агляду. Усе матар'ялы аб сходах, роўна як і аб усім ходзе агляду, павінны тэрмінова накіроўвацца ў рэдакцыю «Зьвязды».

б) Ажыцьцяўленьне ўсіх практычных мерапрыемстваў, вызначаных у сувязі з аглядам праводзіцца заводзкімі цэхавымі арганізацыямі на агульных падставах. Брыгады ніякім чынам не павінны падмяняць сабою адміністрацыю заводзкія і цэхавыя органы, а павінны імкнерна дапамагаць ім, дабіваючыся ад іх выканаўчага правядзеньня і прапановы не падмяняліся агульнымі, нічога не даючымі, разважаньнямі.

8. Брыгады павінны забясьпечыць аку ўдзел у аглядзе рабкораў. У кожным раёне неадкладна ўключыцца ў агляд павінны друк і ўсе рабкораўскія пасты. Вельмі пажадана арганізаваць спэцыяльныя агульнагарадзкіх і агульнаазаводзкіх сходаў рабкораў, прысвечаных задачам агляду. Брыгады павінны забясьпечыць непарыўную сувязь з рэдакцыяй «Зьвязды» і інфармаваць яе аб ходзе агляду. Ад таго, наколькі будуць арганізаваны рабкоры ў цэлым залежыць посьпех агляду.

НА ШТО ТРЭБА РАБІЦЬ УПОР

При правядзеньні агляду праверачныя брыгады павінны канцэнтраваць увагу увагу вакол наступных вузлавых пытаньняў і мабілізаваць вакол іх масы і інфармаваць аб іх рэдакцыю «Зьвязды».

1. Барацьба за ВЫКАНАНЬНЕ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ КОЛЬКАСНЫХ ЗАДАНЬНЯЎ.

2. Выкананьне ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ, што зьяўляецца асабліва важным пытаньнем у даны момант (зьніжэньне сабекошту, якасьць прадукцыі, стварэньне ўдарных брыгад, узорная прадукцыя, барацьба з бракам і г. д.).

3. МАБІЛІЗАЦЫЯ ЎНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ (ліквідацыя залежаў няскончанай прадукцыі, эканомія сыр'ю і апалу, барацьба са стратамі, рацыяналізатарская работа, рабочае вынаходзтва, ажыцьцяўленьне рабочых прапаноў, работа вытворчых нарад, ІТР, загрузка абсталяваньня і г. д.).

4. ПЫТАНЬНІ РАБОЧАЙ СІЛЫ (рацыянальнае выкарыстаньне кваліфікаваных рабочых, вызваленьне свабодных рабочай кваліфікаванай сілы, падрыхтоўка кадраў, барацьба з цякучасьцю.

5. РАБОТА НАЧНЫХ ЗЬМЕН (работа адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу, культурна-бытавое абслугоўваньне начных зьмен, загрузка абсталяваньня).

6. КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА—там, дзе яно праводзіцца. (Забясьпячэньне будаўнічымі матар'ялямі, рабочай сілай, падрыхтоўка абсталяваньня, загрузка варштатаў).

7. РАБОЧАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ, як неадлучная частка барацьбы за прамфінплян (закрытыя разьмеркавальнікі, закрытыя сталоўкі, работа органаў ЦРК і ўдзел заводзкіх арганізацый).

8. Апрача пералічаных пытаньняў, агляд ставіць сваёй мэтай усебакова праверыць і асьвятліць у друку стан ПРАФРАБОТЫ, яе перабудову ў адпаведнасьці з лёзунгам «тварам да вытворчасьці», сапраўдны ўдзел профарганаў у барацьбе за прамфінплян. У гэтых адносінах важна праверка і абмеркаваньне работы ўсіх зьвеньняў—цэхавод—раён—цэнтр. Асаблівай увагі заслугоўвае найбольш адсталы вучастак—культработа.

9. Праверка і асьвятленьне ПАДРЫХТОЎКІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ДА НОВАГА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ павінны канцэнтравацца вакол пытаньняў прапрацоўкі кантрольных лічбаў, складаньня сустрэчных прамфінпляноў, арганізацыі вытворчых манэўраў, не дапускаючы паўтарэньня памылак, дапушчаных у мінулым пры правядзеньні манэўраў. (Захапленьне «Игрой в солдатики», падмена адміністрацыі і г. д).

ПАТРЭБНА НЕПАРЫЎНАЯ СУВЯЗЬ І ІНФАРМАЦЫЯ

Выкананьне задач, пастаўленых аглядам, можа быць ажыцьцёўлена толькі пры ўмове устанаўленьня непарыўнай сувязі прадпрыемства з рэдакцыяй «Зьвязды», пры якой будзе сканцэнтравана кіраўніцтва аглядам.

Брыгады павінны:

1. Неадкладна паведаміць па тэлеграфу або па тэлефону ўключэньне прадпрыемства ў агляд, адначасова падаўшы кароткі зьмест вызначаных мерапрыемстваў па правядзеньні агляду, выпукляючы асабліва характэрныя моманты.

2. Сьпешнай поштай высылаць падрабязныя пляны правядзеньня агляду.

3. Штодзённа прысылаць зводкі аб ходзе агляду, адзначаючы ўсе дасягненьні і недахопы (асабліва аб работе прадпрыемстваў з пункту погляду выкананьня прамфінпляну).

4. Тэлеграфна паведамляць аб усіх выпадках нападак, якія тармозяць работу і патрабуюць неадкладнай умяшальнасьці цэнтральных органаў, а таксама аб усіх фактах дадатнага характару.

5. Да 20-га сьнежня прысылаць падрабязныя даныя аб ходзе агляду, а да 1-га студзеня—аб выніках агляду (усё гэта апрача штодзённых зводак).

6. На рабкораўскіх сходах павінна быць завострана ўвага на неабходнасьці прысылкі кароткіх апэрацыйных карэспандэнцый, якія ілюстравалі б канкрэтныя факты пастаноўкі паасобных пытаньняў работы, каб дзелавыя прапановы не падмяняліся агульнымі, нічога не даючымі, разважаньнямі.

УДАРНАСЬЦЬ І МАСАВАСЬЦЬ — ЗАРУКА ПОСЬПЕХУ

При правядзеньні агляду трэба выходзіць з асноўнага прынцыпу, што важнейшай умовай посьпеху агляду зьяўляецца масавасьць і ўдарнасьць. Усякія спробы вырашаць баявыя пытаньні агляду габінэтным нарадкам павінны сустрэць бязьлітасны адпор.

На аснове актыўнасьці і ініцыятывы рабочае клясы, на аснове разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, мабілізацыі мас вакол бягучых лёзунгаў партыі, бязьлітасна выкрываючы бязьдзейнасьць і самацёк у работе, даючы жорсткі адпор апартуністам усіх толкаў, мы правядзем па-ўдарнаму агляд, забясьпечым поўнае выкананьне праграмы асобнага кварталу, і ў баявой гатоўнасьці сустрэнем трэці рашаючы год пяцігодкі.

Тэлеграма ЦК КП(б)Б

Усім райкомам КП(б)Б

ГАЗЭТА «ЗЬВЯЗДА» РАЗАМ З ВСНГБ і ЦСПСБ АРГАНІЗУЮЦЬ МАСАВЫ АГЛЯД ВЫКАНАНЬНЯ ГАСПАДАРЧЫХ ПРАГРАМ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

МЭТА АГЛЯДУ—ПОЎНАЯ ЛІКВІДАЦЫЯ ПРАРЫВАЎ У ПРАМФІНПЛЯНЕ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ І ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎСТУПЛЕНЬНЯ Ў НОВЫ ГАСПАДАРЧЫ ГОД.

УВЕСЬ АГЛЯД ПРАВОДЗІЦЦА НА АСНОВЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ВЕРАСЬНЁЎСКАЙ АДОЗВЫ ЦК УсеКП(б) і ПАСТАНОЎ АПОШНЯГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б.

НА ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ БССР АРГАНІЗУЮЦЦА ПРАВЕРАЧНЫЯ БРЫГАДЫ ЗАВОДЗКІЯ І ЦЭХАВЫЯ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ РК КП(б)Б.

ЦК АБАВЯЗВАЕ РАЙКОМЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У АГЛЯДЗЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ, КАМСАМОЛУ, ПРАФСАЮЗАЎ, НАЙШЫРЭЙШЫХ МАС УДАРНІКАЎ РАБОЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ — У «ЗЬВЯЗЬДЗЕ» АД 12 СЬНЕЖНЯ.

Сакратар ЦК КП(б)Б К. ГЕЙ.

Забясьпечыць посьпех агляду

Усім кіраўніком аб'яднаньняў і прадпрыемстваў ВСНГ БССР

ПРЭЗЫДЫУМ ВСНГБ ПРАПАНУЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПАСЬПЯХОВАСЬЦЬ ПРАВАДЗІМАГА ГАЗЭТАЙ «ЗЬВЯЗДА, ВСНГБ І ЦСПСБ МАСАВАГА АГЛЯДУ ВЫКАНАНЬНЯ ГАСПАДАРЧАЙ ПРАГРАМЫ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І ПАДРЫХТОЎКІ ДА НОВАГА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ.

МАБІЛІЗУЙЦЕ ЎСІХ РАБОЧЫХ, УВЕСЬ АПАРАТ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ НА ПОЎНУЮ ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ І ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎСТУПЛЕНЬНЯ Ў ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ.

СТАРШЫНЯ ВСНГ БССР—ГРЫСЕВІЧ.

Стварыць аглядавыя брыгады

Гаррайпрафсаветам і фабзаўмясцкомам

ЦСПСБ прапануе безадкладна ўключыцца ў агляд выкананьня прамфінпляну і падрыхтоўкі да трэцяга году пяцігодкі.

Стварэце аглядавыя брыгады. За бясьпечце актыўны ўдзел рабочых, прафактыву і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу. Сыстэматычна інфармуйце «Зьвязду» аб ходзе агляду. Старшыня ЦСПСБ—РЫЖОЎ.

Рабкоры—на лінію агня!

Таварышы рабкоры! Сёньня дзень пачатку генэральнага агляду выкананьня прамфінпляну і падрыхтаванасьці да трэцяга году пяцігодкі. Агляд павінен забясьпечыць круты пералом у ходзе выкананьня заданьняў прамысловасьці, поўнасьцю ліквідаваць прарывы, забясьпечыць баявыя тэмпы для надыходзячага новага гаспадарчага году.

У правядзеньні агляду рабкоры адыгрываюць выключна важную ролю.

Пакажэце прыклад ударнай работы. Вазьмеце на пяро ўсе арганізацыйныя нелады, праявы коснасьці, бюракратызму, апартуністычнай бязьдзейнасьці, усяго, што перашкаджае пасьпяховаму выкананьню прамфінпляну.

Пакажэце з усёй паўнатой прыклады бальшавіцкай работы, практыку перадавых прадпрыемстваў, якія гэраічна змагаюцца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Бесьперапынным патокам карэспандэнцый устанаўляйце адразу-ж сувязь са «Зьвяздой», пры якой канцэнтруецца кіраўніцтва аглядам. Дружна, арганізавана за работу, за штодзённую сувязь, за жывую інфармацыю!

Лічбы, якія павінны прыкаваць увагу

У лістападзе рэспубліканская прамысловасьць працавала горш, чым у кастрычніку

У радзе папярэдніх зводак аб выкананьні прамфінпляну рэспубліканскай прамысловасьцю мы ўжо паказвалі на вельмі ТРЫВОЖНЫЯ СЫМПТОМЫ, якія ставяць пад пагрозу выкананьне сустрэчных прамфінпляноў ударнага кварталу. Пасобныя галіны прамысловасьці і некаторыя буйныя прадпрыемствы мелі ў кастрычніку вялікія прарывы ў выкананьні як колькасных, так і якасных паказальнікаў. ЛІСТАПАД, згодна вестак ВСНГ БССР, НЯ ПРЫНЁС ПАТРЭБНАГА ПЕРАЛОМУ. Наадварот, рэспубліканская прамысловасьць у лістападзе працавала горш, чым у кастрычніку, даўшы зьніжэньне агульнай лічбы з 86,5 проц. ДА 83-85 ПРОЦ. (арыентовачна).

ПА МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ лістапад даў вельмі значнае зьніжэньне выпуску прадукцыі: 61,5 проц. замест 71,4 проц. у кастрычніку. Горш за ўсіх працаваў «ГОМСЕЛЬМАШ». Калі ў кастрычніку ён выканаў праграму на 55 проц., дык у лістападзе — НА 34,7 ПРОЦ. Завод «Поступ Рэвалюцыі» ў Менску замест 83,4 проц. ук эстрычніку, выканаў праграму ў лістападзе на 41,4 проц. Завод «Ударнік» таксама зьнізіў тэмпы з 97,8 проц. да 60,5 проц. «Чырвоны мэталіст» у Віцебску ў лістападзе працаваў крыху лепш: замест 53,6 проц. у кастрычніку, ён даў 61,7 проц. у лістападзе, але і апошняя лічба означае вялізарны прарыў у выкананьні прамфінпляну. Нагул з 16 ПРАДПРЫЕМСТВАЎ Мэталяаб'яднаньня праграму ў лістападзе выканалі ТОЛЬКІ 4.

Амаль ня зрушылася з месца ПАПЯРОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ, якая ў кастрычніку выканала праграму на 84,1 проц., а ў лістападзе — на 84,3 проц., прычым па 4-х прадпрыемствах ёсьць нават зьніжэньне вырабу прадукцыі. Напрыклад, па фабрыцы «Спартак»—11 проц. (замест 87 проц. у кастрычніку, 75,1 проц. у лістападзе). Папяровая фабрыка «Прафінтэрн» — у кастрычніку 89 проц., у лістападзе — 81,9 проц. Асабліва вялікае зьніжэньне тэмпаў па картоннай фабрыцы імя Леніна: замест 92 проц. у кастрычніку — 73 проц. у лістападзе. Таксама ёсьць значнае пагоршаньне работы на картоннай фабрыцы імя Варошыла: замест 106,1 проц. у кастрычніку — 94,3 проц. у лістападзе. Крыху лепш працавала фабрыка «Гэрой Працы» (у кастрычніку 80 проц., у лістападзе 86,5 проц.) і «Чырвоная Зорка» (у кастрычніку 80,2 проц., у лістападзе 85,5 проц.). Але 3 7-мі ПРАДПРЫЕМСТВАЎ папераб'яднаньня, якія прадставілі весткі, выконвае праграму толькі АДНО — КАРДОННАЯ ФАБРЫКА ІМЯ СТАЛІНА.

ЗАПАЛКАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ дае зьніжэньне выпуску прадукцыі: замест 87,4 проц. у кастрычніку — 85,3 проц. у лістападзе. НІ АДНО З ЗАПАЛКАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НЯ ВЫКОНВАЕ ПРАГРАМЫ. Наадварот, фабрыка «Вэзувій» ў лістападзе працавала горш, чым у кастрычніку: 93,6 проц. у кастрычніку, 88,3 проц. у лістападзе. Па гэтым-жа шляху пайшлі запалкавыя фабрыкі «Х Кастрычнік» і «Чырвоная Бярэзіна»: першая выканала ў кастрычніку праграму на 97,9 проц., у лістападзе — на 91,1 проц.; другая адпаведна 94 проц. і 92,6 проц.

ШВЭЙНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ засталася на адным месцы: 69,2 проц. у кастрычніку і 69,1 проц. у лістападзе, прычым па дзьвох фабрыках — віцебскай «Прафінтэрн» і бабруйскай — імя Дзяржынскага ПРАРЫВЫ ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ. «Прафінтэрн» замест 93,1 проц. у кастрычніку дала 78,9 проц. у лістападзе. Фабрыка імя Дзяржынскага замест 88,5 проц. у кастрычніку дала 78,2 проц. у лістападзе. Наогул з 5-ці прадпрыемстваў праграму выконвае толькі два: менская фабрыка «Кастрычнік» — 106 проц. і гомельская фабрыка «Камінтэрн» — 103,2 проц.

Далёка нездавальняючыя вынікі мы маем таксама ПА ШКЛЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, якая выканала праграму лістапада на 94,7 проц., потым па гарбарна-абутковай прамысловасьці, якая выканала праграму толькі на 90,4 проц. Па шкляной прамысловасьці з 6-ці прадпрыемстваў, якія прадставілі весткі, выконваюць праграму толькі два, па гарбарна-прамысловай з 8 прадпрыемстваў — таксама толькі два («Пралетарскі шлях» у Гомелі і гарбарня імя Сталіна ў Магілеве).

Нечакана зьнізіла выпрацоўку ЦАГЕЛЬНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ: замест 100 проц. у кастрычніку — 88 проц. у лістападзе.

ПА ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ вестак яшчэ няма. Вядома толькі, што віцебская фабрыка імя Карла Маркса выканала лістападаўскую праграму на 65,9 проц.

Два заводы ФАСФАРЫТНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ таксама маюць прарывы: Крычаўскі фасфарытны завод дабіўся пералому, выканаўшы лістападаўскую праграму на 80,5 проц. замест 53,7 проц. у кастрычніку. А Клімавіцкі фасфарытны завод замест 113,3 проц. у кастрычніку даў 95,5 проц. у лістападзе — зьніжэньне амаль на 20 проц.

Якія-ж прычыны выклікалі прарывы? «Трыкутнікі» многіх прадпрыемстваў ня здолелі замацаваць актыўнасьць рабочых мас, якая выявілася ў часе правяраньня кантрольных лічбаў ударнага кварталу, складаньня сустрэчных прамфінпляноў і пасьля прапрацоўкі верасьнёўскай адозвы ЦК УсеКП(б). Значны адмоўны ўплыў мае ВЕЛЬМІ МАРУДНЫ ТЭМП ВЫКАНАНЬНЯ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, якія складаюць базу рацыяналізацыі і павялічэньня прадукцыйнасьці працы.

МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА АБ ЗНАЧЭНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ ў большасьці месц зусім невыстарчальная. Да гэтага часу не праводзіцца належная барацьба з АПАРТУНІСТЫЧНЫМІ ЎСТАНОЎКАМІ АБ ТЫМ, ШТО БЫЦЦАМ УДАРНЫ КВАРТАЛ СТВОРАНЫ ВЫКЛЮЧНА ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ ДРУГОГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. Між тым, ударны квартал мае зусім САМАСТОЙНЫ ПРАМФІНПЛЯН, але, АКРАМЯ ВЫКАНАНЬНЯ ЯГО, павінна быць пастаўлена пытаньне АБ ЛІКВІДАЦЫІ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ ДРУГОГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ, калі гэта запазычанасьць была. Таксама некаторыя кіраўнікі недаацэньваюць значэньня ударнага кварталу, ЯК ПЭРЫЯДУ ПАДРЫХТОЎКІ ДА РАШАЮЧАГА ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. А падрыхтавацца да трэцяга году можна толькі НА АСНОВЕ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПАКАЗЬНІКАЎ УДАРНАГА КВАРТАЛУ. УЖО ЗА ЎДАРНЫМ КВАРТАЛЕ павінны быць узяты такія тэмпы, якія дадуць магчымасьць поўнасьцю выканаць кантрольныя лічбы трэцяга году, вызначаныя савецкім урадам.

Трэба неадкладна ўжыць усе меры, каб поўнасьцю выканаць прамфінпляны ўдарнага кварталу. Можна са здавальненьнем адзначыць, што па большасьці галін прамысловасьці АПОШНЯЯ ДЭКАДА ЛІСТАПАДА ЎНЕСЛА ПЕРАЛОМ. Гэта наглядаецца і ПА ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ПА ШКЛЯНОЙ, ГАРБАРНА-АБУТКОВАЙ І ІНШЫХ. Трэба гэты пералом замацаваць.

Значную дапамогу павінна аказаць ДЗЕСЯЦІДНЁЎКА ПРАВЕРКІ падрыхтоўкі прадпрыемстваў да выкананьня сустрэчных прамфінпляну трэцяга году пяцігодкі (вытворчыя манэўры). Гэту дзесяцідзёўка павінна быць арганізавана на працягу АПОШНЯЙ ДЭКАДЫ СЬНЕЖНЯ. Добрая падрыхтоўка да яе, якая павінна пачацца НЕАДКЛАДНА, выкананьне НОВЫХ НОРМ ВЫПРАЦОЎКІ, ПАВОДЛЕ ПАВЯЛІЧАНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ ТРЭЦЯГА ГОДУ, павінна адначасова ліквідаваць прарывы ў справе выкананьня праграмы ўдарнага кварталу.

У АТАКУ ЗА ЛЁН

ЗА БОРТ „АБ'ЕКТЫЎНЫЯ" ПРЫЧЫНЫ!

Ільназагатоўчы плян ударнага месяца павінен быць выкананы

Разгарнуць масавую работу сярод калгасьніц, бяднячак і сераднячак

Забясьпечыць пералом у загатоўках

Тэлеграма СНК усім РВК і загатоўшчыкам

Загатоўкі збожжа і сена, адгрузка бульбы прамысловым раёнам Саюзу, прамысловасьці і гарадом БССР за першую пяціднёўку сьнежня значна ўпалі. У загатоўках ільну, ільнянога семя і канапель пералому няма. Ёсьць зусім нядбайныя адносіны з боку загатоўшчыкаў да сваячасовай дачы вестак аб загатоўках, асабліва ільну па пяціднёўках. Няма вестак аб дачы цьвёрдых заданьняў купацка-заможным гаспадаркам асабліва па ільне і аб выкананьні гэтых заданьняў. Злачынна зацягваецца скончэньне тэрміну збожжазагатовак, не скарыстоўваецца спрыяючае надвор'е для скончэньня загатоўкі і адгрузкі бульбы і гародніны.

Такое становішча далей нецярпіма. Прапаную безадкладна ўстанавіць поўны кантроль над загатоўчай работай па раёне, забясьпечыўшы скончэньне пляну загатовак збожжа, бульбы і га одніны; дабіцца поўнага пералому ў загатоўках ільну, ільнасемя і канапель. Папярэджваю райвыканкомы і загатоўчыя арганізацыі, што невыкананьне гэтай задачы ў бліжэйшыя дні будзе разглядацца, як зрыў важнейшых мерапрыемстваў улады. Інфармуйце СНК.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Полаччына яшчэ не раскачалася

ПОЛАЦАК. (Ад наш. спэц. кар.). Гэтымі днямі адбылася нарада брыгады ЦК КП(б)Б, у склад якой уваходзіць тав. Гурыновіч, сумесна з сакратарамі райкомаў Дрысенскага, Ветрынскага, Асьвейскага, Борквяцкага, Расонскага, Вушацкага, Полацкага раёнаў па пытаньні аб ходзе ільназагатовак.

Выявілася, што тэмпы загатовак ва ўсіх раёнах вельмі слабыя. Так, Дрысенскі раён выканаў плян загатовак ільна-семя на 44 проц. і ільна-валакна на 9,8 проц.; Борквяцкі—25,6 проц. і 0,4 проц.; Асьвейскі—19,3 проц. і 4 проц.; Расонскі—20 проц. і 3 проц.; Вушацкі—30 проц. і 1 проц.; Ветрынскі—28 проц. і 0,4 проц. і Полацкі—27 проц. і 1,7 проц.

Раённыя арганізацыі не разгарнулі належнай масавай агітацыйна - растлумачальнай работыасабліва сярод жанчын і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства і калгасьнікаў наогул. Беднята да гэтага часу яшчэ не мабілізавана на правядзеньне загатовак.

Ва многіх раёнах цьвёрдыя заданьні кулацка - заможным гаспадаркам усё яшчэ не даны.

Значна адстае ў загатоўках сацыялістычны сэктар. У той час, калі індывідуальны сэктар у Дрысенскім раёне выканаў заданьне па загатоўках ільнянога семя на 41 проц., калгасы выканалі толькі на 20 проц. Такія-ж факты ёсьць і па іншых раёнах.

Прэміяваньне здатчыкаў ільну прамтаварамі пастаўлена вельмі дрэнна. Ня гледзячы на выразныя дырэктывы аб прэміяваньні ільназагатовак, Наркамгандлю і Белкаапсаюз ня ўжылі патрэбных мер. Гэта тармозіць ход загатовак.

«Зьвязда» ў свой час пісала аб неабходнасьці забясьпячэньня ільнаводных раёнаў лыкам. Да гэтага часу ні адзін з раёнаў патрэбнае колькасьці лыка не атрымаў.

8-га лістапада адбыўся пробны пуск дрысенскага заводу, але пусьціць завод поўным ходам нельга, з-за адсутнасьці некаторых дэталяй.

Горш стаіць справа з будаўніцтвам боркавіцкага заводу. Фундамант закладзены, аднак, дагатуль не атрыманы будаўнічыя матар'ялы. Трэба з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне перад адпаведнымі арганізацыямі аб фарсаваньні будаўніцтва боркавіцкага заводу.

Нарадай ужыты рад тэрміновых мер да ўзмацненьня ільназагатовак у раёнах былой Полацкай акругі.

Нарада адзначыла, што ў радзе раёнаў з боку асобных арганізацый былі дапушчаны грубыя скажэньні партыйнай лініі праваапартуністычнага характару. Калі прыняць пад увагу, што некаторыя мясцовыя работнікі высоўвалі і падтрымлівалі тэорыю аб адсутнасьці і «зьнікненьні» кулака, дык стане зразумелым недапушчальна слабое наступленьне ільну ад кулака ў такіх мясцох.

РУБІН.

Вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці

ГАРАДОК. (Брыгада Калгаспэнтру). Гарадоцкі раён добра вядомы, як ільнаводны раён. На жаль, гэтага ня ўлічвае кіраўніцтва раёну. Да апошняга часу ні райком, ні райвыканком не займаліся спэцыялізацыяй раёну. Аб гэтым яркa сьведчыць той факт, што пасеўная плошча ільну складае толькі 10 проц. агульнай ворнай плошчы, г. зн. менш па 5 проц., чым павінна была займаць сёлета.

Да пераапрацоўкі ільну-валакна амаль ні адзін калгас у раёне яшчэ ня прыступіў. Загатоўчыя арганізацыі не далі ніякіх паказаньняў аб апрацоўцы ільну, а кіраўнікі калгасаў ня ўжылі ніякіх мер, каб мабілізаваць увагу калгасьнікаў на неадкладнае выкананьне гэтай задачы. У выніку пён застаўся неапрацаваным.

Аб апартуністычнай бязьдзейнасьці раённых арганізацый у галіне гаспадарчага замацаваньня калгасаў яскрава сьведчыць наступнае.

На некаторых калгасах («Камсамолец», імя Сталіна, «Ленінскі шлях», «Чырвоны авіятар») каля 20 гэктараў ільну засталося пад сьнегам. Лён папсаваўся.

У калгасе імя Чарвякова лён з 22 гэктараў, з-за няўважлівых адносін праўленьня да першапачатковай апрацоўкі, на 60 проц. страціў сваю якасьць.

У камуне імя Леніна засталося пад сьнегам 20 гэктараў ільну, 12 гэкт. аўсу, 5 гэкт. вікі і гароху. Гэта шкодніцтва стане вразумелым, калі прывесьці факт, які характарызуе кіраўніцтва камуны. Кіраўнік Бярозаўскага аддзяленьня гэтай камуны Групко на сходзе камунараў выступіў з тыповай кулацкай прамовай, у якой адзначыў, што «ў камуне кепска жывецца, не даюць абутку і вопраткі, скора прыдзецца пакінуць камуну і пайсьці на хутары». Гэты агент клясавага ворага, давёўшы камуну сваім злачынным кіраўніцтвам да такога становішча, імкнуўся зваліць віну на партыю і савецкую ўладу.

У камуне імя Сталіна, у выніку разлажэньня паасобных партыйцаў і прымірэнцкіх адносін з боку партыйнай ячэйкі да шкодніцкай работы кулака ўнутры калгасу, частка збожжа засталася на полі. Гэта выклікала абурэньне лепшых калгасьнікаў і вакольных сялян-адзіначаособнікаў.

Ня дзіва, што да апошняга часу не наглядаецца прыліву ў адначаныя калгасы.

У камуне імя Чарвякова ўраджай ляжыць у скірдах не абмалочаным. Між тым, у суседняй камуне «Чырвоны сьцяг» ёсьць складаная малатарня, якая можа перамалоць збожжа камуне імя Чарвякова. Гэта непасрэдная віна праўленьня.

Пры камуне «Чырвоны сьцяг» і Вайканскай базе пабудаваны два ільнасушыльна-мяльныя пункты, на якіх маркуецца апрацоўваць каля 4-х тон ільну ў суткі. На сёньнешні дзень ні адзін з гэтых пунктаў ня прыступіў да работы.

7 ільнамялак стаяць бяз руху на базах райкалгассаюзу. Райкалгассаюзы ня вызначылі калгасам тэрмінаў апрацоўкі і здачы ільну-валакна і семя.

Сярод насельніцтва не разгорнута ніякай растлумачальнай работы. Шырокія калгасныя і бядняцка-сераднянцкія масы адзінаасобнікаў на сёньнешні дзень зусім ня ведаюць аб прэміяваньні прамтаварамі за здачу ільну.

У радзе сельсаветаў (Аляксандраўскім, Вайканскім, і інш.) цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных гаспадарак не даведзены.

Усе гэтыя ганебныя факты ставяць пад пагрозу разьвіцьцё тэхнічных культур у раёне, сваячасовую і добраякасную апрацоўку ільну-валакна для забясьпячэньня нашых фабрык сырцом.

КУРГАН.

Лён не апрацован

СТАРАСЕЛЬЛЕ (Копыскі раён). У калгасе «Бальшавік», Старасельскага сельсавету, да гэтага часу лён яшчэ ня мяты і амаль увесь ляжыць пад адкрытым небам. Праўленьне калгасу ня прымае ніякіх мер, каб хутчэй апрацаваць лён і выканаць свой плян загатовак. Калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры, лён загіне.

Генін.

ЗРУХ у Лёзьненшчыне

ЛЁЗНА. (Ад наш. спэцкора). Апошнія дні паказваюць некаторы зрух у загатоўках ільнавалакна і насеньня ў Лёзьненшчыне.

Так, НА 1-га СЬНЕЖНЯ МЫ МЕЛІ 12 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ПА ІЛЬНАВАЛАКНЕ І 80,1 ПРОЦ. ПА ІЛЬНЯНЫМ СЕМІ, НА 5 СЬНЕЖНЯ ПЛЯН ВЫКАНАНЫ ПА ВАЛАКНЕ НА 17 ПРОЦ. І ПА ІЛЬНАСЕМІ — НА 65 ПРОЦ. (ПАВОДЛЕ НЯПОЎНЫХ ВЕСТАК).

За тры дні — 5-

Заява т. Ігнатоўскага

Рэдакцыя прадастаўляе месца наступнай заяве т. Ігнатаўскага

***

Шпаркімі крокамі ідзе ўся наша дзяржава дыктатуры пралетарыяту па шляху сацыялізму, пад кіраўніцтвам магутнага, сталёвага авангарду рабочай клясы—камуністычнай партыі. Творчы ўздым пралетарскіх мас, шырока разгорнуты калгасны рух сярод бяднацка-серадняцкага сялянства забясьпечвае далёка датэрміновае выкананьне нашага грандыёзнага пяцігадовага пляну рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Шпаркія тэмпы індустрыялізацыі, посьпехі калектывізацыі, усё наша наступленьне на сацыялістычным фронце выклікала шалёнае супраціўленьне ўсіх нашых клясавых ворагаў як унутры, так і за межамі нашай краіны. Заварушыліся ўсе варожыя контр-рэвалюцыйныя сілы — буржуй, — нэпман, кулак, фашыст і г. д.—і пусьцілі ў ход усе сродкі, каб падарваць сацыялістычнае будаўніцтва, каб зьнішчыць дзяржаву дыктатуры пралетарыяту.

Кулакі і нэпманы, рэшткі буржуазнай інтэлігэнцыі, папы розных вер, былыя людзі і іншыя шкоднікі розных нацыянальнасьцяй і гатункаў усяго СССР, згубіўшы надзею толькі «домашними» сродкамі сарваць сацыялістычнае будаўніцтва і зьнішчыць дзяржаву дыктатуры пралетарыяту, працягнулі руку замежнаму буржуазнаму фашызму, каб сумеснымі сіламі нападзіць інтэрвэнцыю, каб заліць савецкую зямлю крывёю пралетарыяту і бяднацка-серадняцкага сялянства, каб вярнуць фабрыкантам фабрыкі і заводы, абшарнікам—маёнткі і наогул буржуазіі—уладу. Цэлы рад фактаў, асабліва апошняга часу, сьведчыць аб гэтым.

І ў БССР, у гэтым фарпосьце пралетарскай дзяржавы Савецкага Саюзу, контр-рэвалюцыя таксама не дракала. Яна рыхтавала свае сілы, апіраючыся на буржуя, кулака, былога чалавека і г. д. Асабліва шпаркія тэмпы індустрыялізацыі ў БССР, рост калектывізацыі, ліквідацыя на яе базе кулацтва як клясы, ленінскае разьвязваньне нацпытаньня, пабудова культуры, пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме і г. д.—выклікалі шалёнае супраціўленьне нашых клясавых ворагаў у БССР. Яны пачалі актывізавацца. Асабліва разгарнулі свае шкодніцкую і контр-рэвалюцыйную дзейнасьць беларускія сацыял-дэмакраты, апіраючыся на буржуазію і кулацтва і зьяўляючыся выяўнікамі іх інтарэсаў, не востры меч дыктатуры пралетарыяту—ДПУ пасьпеў своячасова прыкінуць дзейнасьць гэтай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, на чале якой стаялі «дзеячы» БНР—Ластоўскія, Цьвікевічы, Некрашэвічы і г. д.

Выкарыстаўшы дазвол савецкай улады на зварот іх на тэрыторыю БССР, яны рабілі сваю агідную контр-рэвалюцыйную працу, яны разьвівалі і расьцілі тайную контр-рэвалюцыйную арганізацыю, якая паставіла сваёй мэтай у крыві рабочае клясы, капгасьнікаў і наогул бяднацка-серадняцкага сялянства патапіць нашу дзяржаву дыктатуры пралетарыяту. Клясавая нянавісьць да дыктатуры пралетарыяту аб'ядналa гэтых беларускіх нацдэмаў з расійскімі і украінскімі шкоднікамі і контр-рэвалюцыянэрамі, з якімі яны устанавілі шчыльную сувязь. Яны устанавілі таксама шчыльны кантакт з агентамі польскай дэфэнзывы ў Зах. Беларусі, беларускімі нацыянал-фашыстамі — Луцкевічамі, Станкевічамі, Астроўскімі і інш.; працуючы з імі па адзіным інтэрвэнцкім плане, каб замест Савецкай Беларусі стварыць буржуазна-фашысцкую БНР, якая складала-б фэдэрацыйную частну буржуазна-фашысцкай Польшчы Піласудзкага.

Для сваіх агідных контр-рэвалюцыйных мэт яны выкарысталі рад савецкіх устаноў, у тым ліку НКА, ІБК, а потым БАН, у часы, калі я там стаяў на чале кіраўніцтва. Гэта выкарыстаньне зрабілася магчымым, дзякуючы майму нацыянал-апартунізму ў тэорыі і на практыцы.

Адным з асноўных зьвяньняў, якім змыкаўся нацыянал-апартуніст з нацыянал-дэмакратам было буржуазна-кулацкае, контр-рэвалюцыйнае «адраджэнства», сканцэнтраванае ў свае часы каля «Нашай Нівы». Яно было ідэалізавана, як і «Наша Ніва», буржуазна-кулацкай нацыяналістычнай інтэлігэнцыяй, як «вялікі рух адраджэньня мужыцкай Беларусі». Яно прасякнула ў такім выглядзе ў савецкую кнігу, прасякнула ў пасобныя зьвяньні партыі, як нацыянал-апартунізм, і існавала і існуе па-за партыяй, як нацыянал-дэмакратызм. Між іншым, пры дапамозе гэтага «адраджэнства» рабілася змычка паміж нацыянал-апартуністам і нацыянал-дэмакратам. Гэта пытаньне кай распрацоўкі для выкрыцьця ўсёй рэакцыйнай і контр-рэвалюцыйнай сутнасьці адраджэнства, што я паставіў сваёй бліжэйшай мэтай зрабіць пад кіраўніцтвам і пры дапамозе партыі.

Перажыткамі «адраджэнства», якія засталіся ў мяне ад эсэраўска-грамадаўскага мінулага, наогул маім нацыянал-апартунізмам у тэорыі і на практыцы, незалежна ад таго, хацеў я ці не хацеў, я выконваў сацыяльны заказ нашых заклятых клясавых ворагаў, быў іх палітычным рупарам і зброяй і змыкаўся з нацдэмамі. Дзякуючы гэтаму, я зрабіўся, па правільнай фармулёўцы т. Гея, «нацыянал-дэмакратам з партбілетам у кішэні». Ня ведаючы аб існаваньні контр-рэвалюцыйнай групы, я тым ня менш служыў інтарэсам контр-рэвалюцыі, накіраванай супроць дыктатуры пралетарыяту як у БССР, так і ў СССР.

Сваю цяжкую віну перад партыяй я прызнаю безагаворачна. Маімі перажыткамі «адраджэнства» і наогул нацыянал-апартунізмам я нанёс вялікую шкоду партыі і шырока разгорнутаму сацыялістычнаму будаўніцтву, за што я сябе рашуча асуджаю. Зусім правільна пленум ЦК КП(б)Б пастанавіў вывесьці мяне са складу Бюро ЦК і ЦК і перадаў справу аб далейшым маім знаходжаньні ў партыі ў ЦКК, дзе яна і разьбіраецца.

Я ня ведаю, чым скончыцца справа аба мне ў ЦКК КП(б)Б. Але як-бы сурова і цяжка для мяне яна ня скончылася, я добра ведаю, што мой асноўны абавязак перад ЦКК КП(б)Б выкрыць да канца маю цяжкую віну перад партыяй, шчыра дапамагчы ЦКК зрабіць самы поўны і глыбокі аналіз тэй шкоды, якую я прынёс партыі, і выкрыць канкрэтныя карэньні ўсёй сыстэмы маіх апартуністычных поглядаў і практычных дзеяньняў.

Як не балюча, як ня цяжка гэта для мяне, але перад ЦКК КП(б)Б і перад усёй партыяй я цьвёрда павінен прызнаць, што палітычна я зрабіў здраду перад партыяй, хоць і не хацеў зрабіць гэтага суб'ектыўна. Тым ня менш здрада застанецца здрадаю і сутнасьць справы ад гэтага не мяняецца. З усёй цьвёрдасьцю, якую мне прышчапіла бальшавіцкая партыя, ня гледзячы на мае неадназначныя хістаньні і адыходы ад лініі партыі, я прызнаю, што бязумоўна і да мяне адносяцца жорсткія, але праўдзівыя, словы У. І. Леніна, якія ён сказаў яшчэ ў 1920 г. «Искренно» об'явивший себя коммунистом человек, который на деле вместо беспощадно-твердой, непоколебимо-решительной, безразлично-смелой и героической политики (только такая политика соответствует признанию диктатуры пролетариата) колеблется и малодушничает,—подобный человек своей бесхарактерностью, своими колебаниями, своей нерешительностью совершает такую-же измену, как и непосредственный предатель. В личном смысле разница между предателем по слабости и предателем по умыслу и расчету очень велика; в политическом отношении этой разницы нет, ибо политика—это фактическая судьба миллионов людей, а эта судьба не изменяется от того, преданы ли миллионы рабочих и бедных крестьян предателями по слабости или предателями из корысти». (Ленин, т. XVII, стр. 15).

Урэшце я ведаю, што якая-б ня была пастанова ЦКК, той удар, які я пераношу па сваёй выключна віне на адзінаццатым годзе прабываньня ў партыі і на пяцідзесятым годзе майго жыцьця, ня пройдзе для мяне дарам, а будзе для мяне моцнай навукай для далейшага.

Прызнаючы сваю цяжкую віну перад партыяй і пралетарыятам, заяўляю, што я рашуча адмяжоўваюся ад маіх нацыянал-апартуністычных поглядаў, якія прывялі мяне да здрады партыі, аб чым я гаварыў вышэй. Заяўляю, што да канца дзён майго жыцьця ўсе сілы і здольнасьць аддам на барацьбу за ленінскую лінію нашай партыі, на будаўніцтва сацыялізму і на ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту, рашуча выкрываючы як свае ранейшыя нацыянал-апартуністычныя погляды, так і наогул сутнасьць нацыянал-апартунізму і нацыянал-дэмакратызму, выкрываючы карэньні, прыводзячыя да контр-рэвалюцыі і контр-рэвалюцыйных плыняй. Якая-б ні была пастанова ЦКК, я застануся ў радох будаўніцтва вялікага сацыялістычнага будаўніцтва.

Разам з пралетарыятам і ўсёй савецкай грамадзкасьцю я падымаю і свой голас абурэньня контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю нацдэмаў і патрабую для іх самай суровай кары з боку органаў пралетарскай дыктатуры.

У. ІГНАТОЎСКІ.

Дамо дактароў раёнам

ПК Аховы Здароўя БССР і ЦП саюзу мэдсанпрацы зьвярнуліся да ўсіх мэдработнікаў БССР з адозвай, у якой, між іншым, гаворыцца:

«Выкананьне адозвы ЦК УсеКП(б) ад 3-га верасьня ставіць перад мэдработнікамі наогул, перад дактарамі, як найбольш кваліфікаванай часткай саюзу, у асабліваські, складанейшыя праблемы: санітарнае аздараўленьне пралетарскіх гарадоў і сацыялістычнага сэктару вёскі, паляпшэньне санітарнага становішча прадпрыемстваў, аховы і ўмоў працы, выручэньне і зьнішчэньне прафзахворваньня, актыўны ўдзел у паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, школьнай санітарыі і г. д.

Разам з вялікімі дасягненьнямі, якія мы маем у справе аховы здароўя наогул і ў абслугоўваньні сацыялістычнага сэктару вёскі—у прыватнасьці,—найбольшым прарывам зьяўляецца незабясьпечанасьць кваліфікаваным мэдперсаналам, у першую чаргу дактарамі сацыялістычнага сэктару вёскі.

Становішча, якое мы маем у гэтым напрамку, зьяўляецца зусім недапушчальным. Дзесяткі мэдычных вучасткаў гадамі застаюцца без дактароў, у дзесятках вучасткаў на 30-40 тыс. насельніцтва працуе адзін доктар; зубных дактароў падвычай мала; некаторыя аптэкі закрыты, з прычыны адсутнасьці фармацэўтаў; цякучасьць складу мэдперсаналу (дактароў, зубных дактараў і фармацэўтаў) вялікая, што моцна перашкаджае правільнай пастаноўцы аховы здароўя ў раёнах.

Такога становішча нельга цярпець, яно павінна быць зараз-жа ліквідавана. Тыя меры, якія да гэтага часу прыняты—узмацненьне прыёму ў мэдінстытут, значнае пашырэньне сеткі школ,—могуць у бліжэйшы час ліквідаваць гэты прарыў.

Мы павінны ў сучасны перыяд правесьці толькі адно—накіраваць сотні мэдработнікаў, дактароў у першую чаргу, з гораду ў вёску; у гэтым павінна быць праўлена палітычная актыўнасьць мэдычнай масы разам з рашучай барацьбой з цякучасьцю і лятунствам.

НКАЗ і ЦП саюзу мэдсанпрацы заклікаюць мясы кваліфікаваных мэдработнікаў шляхам сацспаборніцтва паміж калектывамі, шляхам нытворчых манэўраў у нашых установах даць раёнам у хутчэйшы час сотні дактароў і інш. кваліфікаваных мэдработнікаў».

ЗЬВЯЗДА

Па Савецкай Беларусі

30 лепшых ударнікаў--на перавыбары сельсаветаў

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). За апошні час падрыхтоўка да перавыбараў гарсавету разгарнулася ва ўсю шырыню. Скончана складаньне сьпісаў асоб, пазбаўленых права голасу. Канчаецца складаньне сьпісаў выбаршчыкаў. Прэзыдыум гарсавету ўжо разгледзеў звыш 800 заяў аб адпаўленьні ў правах голасу.

Праведзена нарада загадчыкаў школ па пытаньні ўдзелу настаўнікаў і вучняў у кампаніі.

На прадпрыемствах і ўстановах праходзяць справаздачныя сходы гарсавету.

У спрэчках па справаздачах разгарнулася вельмі ажыўленая крытыка і самакрытыка работы гарадзкога савету. У рэзалюцыях рабочыя абавязуюцца у адказ на вылазкі шкоднікаў — агентаў інтэрвэнцыі і контр-рэвалюцыянэраў—беларускіх нацыянал-дэмакратаў—дабіцца 100-проц. яўкі на перавыбарчыя сходы.

Магілеўскі гарсавет уключыўся ў савецкую эстафэту і выклікаў на сацспаборніцтва Бабруйскі гарадзкі савет.

Вялікая работа праведзена прафэсыянальнымі арганізацыямі раёну.

30 лепшых ударнікаў выехалі на перавыбары сельсаветаў і прабудуць на вёсцы каля трох тыдняў.

Райпрафсавет правёў канфэрэнцыю рабочых, жонак рабочых і служачых. Канфэрэнцыя пастанавіла паслаць брыгады работніц і дэлегатак на перавыбары сельсаветаў для забясьпячэньня лепшага ўдзелу жанчын-выбаршчыц.

А. Лясны.

Чырвоны абоз імя АДПУ і дадатковая падпіска на пазыку

Бешанковічы. (Наш кар.). 7-га сьнежня на двух выбарчых вучастках Сьвечанскага сельсавету, Бешанковіцкага раёну адбыліся выбарчыя сходы. На сходы зьявілася 73 проц. выбаршчыкаў. Жанчын-выбаршчыкаў прысутнічала 70 проц.

Выбарчыя сходы прайшлі з вялікай актыўнасьцю. Па справаздачы сельсавету разгарнуліся жывыя спрэчкі.

Выступаўшыя ў спрэчках ухвалялі генэральную лінію нашай партыі, якая забясьпечыла вялікія дасягненьні на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Усе кандыдатуры, рэкамандаваныя партыйнай ячэйкай, прайшлі аднагалосна.

У адказ на шкодніцтва «прампартыі», на спробы падрыхтоўкі інтэрвэнцыі калгасьнікі, беднякі і серадняки-адзінаасобнікі арганізавалі ў часе перавыбараў чырвоны абоз імя АДПУ. Тут-жа на выбарчых сходах разгарнулася дадатковая падпіска на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады». За некалькі хвілін падпіска дасягнула 150 руб.

У адказ інтэрвэнтам

Узмацняем абароназдольнасьць краіны

ТУРАЎ. (БРЫГ. «ЗЬВЯЗДЫ»). НА СХОДЗЕ БЕДНАТЫ В. ЗАПЯСОЧНАЕ ПАСЬЛЯ ДАКЛАДУ АБ ЗАДАЧАХ СПРАВАЗДАЧНА - ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ СЕЛЬСАВЕТАЎ БЕДНЯКІ АРГАНІЗАВАЛІ ЗБОР ГРОШАЙ НА АБАРОНУ КРАІНЫ, ВЫКЛІКАЮЧЫ АДЗІН ДРУГОГА. ПАЧЫН ЗРАБІЛІ КАЛГАСЬНІК т. ШЭЭД і КАЛРАСЬНІЦА М. САМЕЦ. САБРАНА 52 РУБ. СХОД БЕДНАТЫ ВЫКЛІКАЎ НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ЛЕПШАЙ ЯЎЦЫ НА ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ, ПА ПОЎНЫМ І СВАЯЧАСОВЫМ ВЫКАНАНЬНІ ЗАГАТОВАК ІНШЫЯ ВЁСКІ СЕЛЬСАВЕТУ.

СХОД ВЫБРАЎ БРЫГАДЫ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ДАПАМАГЧЫ СЕЛЬСАВЕТУ ВЫКАНАЦЬ ЗАГАТОЎКІ ПА ЎСІХ ГАЛІНАХ.

ПАСЛАНА ПРЫВІТАЛЬНАЯ ТЭЛЕГРАМА АДПУ—ВЕРНАМУ ВАРТАЎНІКУ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

П.

Створана таварыства марксыцкіх дзяржаўнікаў

5 сьнежня г. г. адбыўся першы ўстаноўчы сход работнікаў тэорыі і практыкі савецкага будаўніцтва і права, прысьвечаны арганізацыі беларускага т-ва марксыцкіх дзяржаўнікаў. На сходзе прысутнічала каля 37 чалавек.

Сход пастанавіў арганізаваць беларускае т-ва марксыцкіх дзяржаўнікаў, аб'яднаць усе сілы БССР у галіне тэорыі і практычнага кіраўніцтва савецкім будаўніцтвам і правам.

Сход выбраў праўленьне ў складзе 5 таварышоў: Хацкевіча, Канаплёва, Галанза, Ракава і Гершальмана.

Старшынёю т-ва выбран тав. Хацкевіч.

Навуковым сакратаром т. Канаплін.

Агульны сход арганізатараў т-ва, а потым і праўленьне т-ва выказаліся за неабходнасьць пастаноўкі дакладу на пасяджэньні адзін з сэкцый першага ўсесаюзнага зьезду марксыцкіх-дзяржаўнікаў, які адбудзецца ў Маскве ў канцы сьнежня месяца, на тэму: «Правы буржуазна-юрыдычнай ідэалёгіі вялікадзяржаўнага шавінізму, беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў розных колераў у тэорыі і практыцы савецкага будаўніцтва і права ў БССР».

Праўленьне т-ва намецела склікаць пашыраны агульны сход членаў т-ва 20 сьнежня (да канца сэсіі), на які будуць запрошаны ўдзельнікі сэсіі ЦВК. На гэтым сходзе мяркуецца абгаварыць даклад тав. Канаплёва аб становішчы на фронце савецкага будаўніцтва і права ў БССР і аб задачах т-ва, а таксама выбраць дэлегатаў ад усебеларускага т-ва на першы ўсесаюзны зьезд марксыцкіх дзяржаўнікаў.

ПАСТАНОВА

Аргбюро ЦК КП(б)Б аб скліканьні Менскай гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі

Згодна пастановы Бюро ЦК КП(б)Б ад 6-XII 30 г. аб арганізацыі Менскага гаркому, Аргбюро па скліканьні Менскай гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі пастанаўляе:

1. Склікаць Менскую гарадзкую партыйную канфэрэнцыю 25-XII 30 г. у 7 гадзін вечара з наступным парадкам дня:

а) чарговыя гаспадарча-палітычныя задачы партыі;

б) выпікі выкананьня прамфінпляну за асобны квартал і задачы трэцяга году пяцігодкі;

в) выбары гаркому і гар. КК.

2. Выбары дэлегатаў на канфэрэнцыю пачаць па ячэйках з 17-XII 1930 г. Модус—адзін дэлегат ад 15 членаў партыі з пастаноўчым голасам і адзін дэлегат ад 30 кандыдатаў з дарадчым голасам. Ячэйкі, якія налічваюць менш 15 членаў партыі, пасылаюць аднаго дэлегата з пастаноўчым голасам.

3. Лічачы неабходным арганізаваць гарадзкую кантрольную камісію КП(б)Б і гарком камсамолу прасіць ЦКК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ хутчэй вырашыць усе пытаньні, зьвязаныя з арганізацыяй гар. КК і гаркому камсамолу.

Аргбюро.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— **Дом Камасьведы.** У 19 з пал. гадз. — вечар «За вучобу» камсам. арганізацыі. Пасьля дакладу — канцэрт. Білеты па РК ЛКСМБ. У 19 гадз. — групавая кансультацыя для прапагандыстаў усёй сеткі партасьветы «Пастановы 2-га пленуму ЦК КП(б)Б аб ліквідацыі акруг і задачах узмацненьня раёнаў».

— **Фрунзаўскі РК КП(б)Б.** У 19 гадз., у пам. прыёмнай ЦВК (пляц Волі, 7) склікаецца дэлегацкі сход паступных прадпрыемстваў і ўстаноў: зав. «Камунар», Эльвод, Абкамтрэст, п/к. «Уціль», сап. рэканструкцыі (Шырокая, 28). Запрашаюцца ўсе т. т. аграрнікі-марксысты г. Менску. Парадак дня: кандрацьцеўшчына ў БССР (працяг).

— **Інстытут пэдагогікі.** У 19 г. (Унів. гарадок, прыр. корп.) — сход т-ва пэдагогаў-марксыстаў. Запрашаецца настаўніцтва.

— **Пэдгабінэт.** У 19 гадз. — сходы настаўнікаў: 2-х груп па пераглядзе праграм, 3-х груп па распрацоўцы паступнай тэмы, настаўнікаў нямецкай мовы па праграмных пытаньнях.

— **Камвуз.** У 19 з пал. гадз., аўд. 25—агульны сход супрацоўнікаў камвузу. Парадак дня: справаздача і перавыбары мясцкому. Яўка ўсіх супрацоўнікаў і выкладчыкаў абавязкова. Запрашаецца камісія па праверцы працы мясцкому.

— **БАН.** У 20 гадз., аўд. 225, гал. корп. ВДУ — пасяджэньне брыгады па разглядзе эканамічнай прадукцыі БАН. У 19 гадз. — пасяджэньне сэмінару па дыялектыцы для аспірантаў-літаратараў.

— **МК БДУ.** З 12 да 15 сьнежня ад 16 да 19 гадз., у чырв. кутку МК ВДУ (гал. корп.) праводзіцца перарэгістрацыя найнічыкаў МІРК.

— **Навук. асацыяцыя.** У 19 гадз. у аўд. анатам. ін-ту — чарговае пасяджэньне мэдыка-біялёгічнай сэкцыі навуковай асацыяцыі.

ЗАЎТРА:

— **Фрунз. райсавет ваяўнічых бязбожнікаў** склікае ў 19 гадз., у пам. Дому Камасьведы, нараду сакратароў ячэек бязбожнікаў і членаў бюро. На нараду запрашаюцца прадстаўнікі АСО, МОПР, ВКС, БДК, культсэктар ЦСПСБ, рэд. газ. «Зьвязда», «Рабочий», «Орка», «Чырв. Зьмена», «Сав. Беларусь», «Акцябр» і прадстаўнік ЦСВБ БССР, — па пытаньні аб правядзеньні антыкаляднай кампаніі. Яўка абавязкова.

— **Дом Асьведы.** У 19 гадз — агульны сход тэхнрацаўнікоў саюзу працасьветы. Яўка абавязкова. У 20 гадз. — вечар асьветнікаў сумесна з вайсковай падшэфнай часьцю. Канцэрт арт. В. Дохоўскай.

— **Клюб навук. працаўнікоў.** Вечар сустрэчы навуковых працаўнікоў г. Менску з беларускімі пралетарскімі пісьменьнікамі (БелАПП) і мастакамі. Білеты ў канц. клюбу з 9—10 г. веч.

— **ЦСПСБ.** У 11 г. ран. у пам. залі пасяджэньняў — працяг сходу бібпрацаўнікоў па пытаньні адзінай бібсеткі.

— **БАН.** У 18 гадз. — працяг сэмінару па мэтадалёгіі літаратуры.

— **МК мэдінстытуту.** У 19 гадз.—сход усіх навуковых і тэхнічных працаўнікоў мэд. ін-ту ў пам. анатам. корп.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ МОПРАЎСКІ МАСАВЫ ВЕЧАР

У СУБОТУ, 13 СЬНЕЖНЯ

КЛЮБ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ Імя К. МАРКСА.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ МОПР'у БССР сумесна з Фрунзаўск. і Кастрычн. Райкомамі МОПР'у

арганізуе

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ МОПРАЎСКІ МАСАВЫ ВЕЧАР,

ПРЫСЬВЕЧАНЫ

рэвалюцыйнаму змаганьню супроць фашыстаўскага тэрору у Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне і Польшчы.

З дакладамі выступяць: прыбыўшыя з Польшчы былыя правадыры

БЕЛАРУСКАЙ-РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ГРАМАДЫ

т.т.: Рак-Міхайлоўскі, Матла, Буросэвіч, а таксама ахвін з былых кіраўнікоў Беларускага Рабоча-Селянскага Клюбу—«Змаганьне» з Польскім, Сойме т. Грэцкі.

Пачатак роўна а 7-й гадзіне ўвечары.

Увечары на вечар па білетах, якія ячэйкі МОПР'у могуць атрымаць у райкомах МОПР'у штодзённа ад 7-мі да 10 гадз. увечары.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ МОПР'у БССР.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б і РКК КП(б)Б

скліканы

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ РК КП(б)Б

14 сьнежня, у 7 гадз. веч., у памяшк. РК.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб арганізацыі гаркому.
2) Аб ходзе падрыхтоўчай і перавыбарчай кампаніі гарсавету.
3) Прыём у партыю.

Усім членам пленуму РК, РКК і членам рэвіз. камісіі, а таксама ўсім сакратарам партколектываў і ячэек зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр

12, 13, 14 сьнежня—адкрытыя спэктаклі.

У. Вішнеўскі.

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

прысьвечана Чырвонай арміі.

Пастаноўка У. Тэаўроўскага. Мастак Б. Катрунін. Музычна Старжынскага. Фота для сьветавых дэкарацый І. Салавейчыка. Дырыжэр І. Гіттарэ. Хормайстар И. Кауфман. Пам. рэж. Л. Бурыло.

ПАЧАТАК роўна у 8 гадз. веч.

ДОМ СЕЛЯКІНА 12 і 13 сьнежня — спэктаклі Беларускага Дзяржаўнага вандроўнага тэатру пад кіраўн. нар. арт. ГАЛУБКА.

„ГАЛЬШТУК"

п'еса ў 3-х дзеях, 9 абразох Глебава. Пастаноўка Міцкевіча.

Пачатак у 8 з пал. г. в. Каса адкрыта з 4 г.

1-шае ў БССР Гукасе кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ПАДВОЙНАЯ ПРАГРАМА

1. Выдатны настацкі нямы фільм СОННАЯ КРАСУНЯ кін о-п'еса ў 5-ці частках.

2. Гукавы фільм. КАНЦЭРТ ВЯДОМЫХ АРТЫСТАЎ БАРОЎСКАЙ І ЧАРАВА.

Пачатак а 6 пал., 8 з пал. і 10 з л. г. увеч.

Каса адкрыта ад 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура"

Настацкі фільм „ЗЯМЛЯ"

Звыш праграмы: Кіно-хроніка ПРАЦЭС ШКОДНІКАЎ („Прампартыя").

Пасьля кожнага сэансу КАНЦЭРТ.

Пачатак—а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

Каса—ад 5 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

Замежны фільм РЭЙНСКІ БУНТАР

Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз.

Каса—ад 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары"

Новы настацкі фільм вытворчасьці Беларускіно АЛЕСЯ

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ 5-ы ДЗЕНЬ АДПАЧЫНКУ.

Пачатак у 6 гадз., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.

Каса адкрыта з 4 гадз.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"

Гістарычны фільм Тарас Шаўчэнка 2-я серыя.

Пачатак 1-га сэансу ў 1 гадз. дня

Каса—з 11 гадз. 30 м.

КІНО „СпартаК"

На экране Ігар ІЛЬІНСКІ ў фільме ПРАЦЭС аб 3.000.000

Камэдыя ў 6 частках.

Пачатак сэансаў: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м.

Каса—з 4 г. 30 м.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ ў г. МАГІЛЕВЕ на кватэру ў МЕНСКУ. Запытацца па адрасе: г. Менск, Савецкая, 68, кв. 8.

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ 1 дакументу 50 к.

ДОМ АСЬВЕТЫ

18 сьнежня Беларускім Другім Дзяржаўным тэатрам будзе дана у Дзяржтэатры пастаноўка для членаў саюзу працасьветы

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

Білеты са скідкай у канц. Дому ад 11—2 і ад 6—10 гадз. веч.

Просьба да старшынь райвыканкомаў, прыбыўшых на сэсію ЦВК БССР, зайсьці ў Белдзяржкіно (Савецкая вул., № 90) па пытаньні кінафікацыі раёнаў БССР.

Прыём штодзённа ад 3 да 4 з пал. гадз. дня.

Праўленьне Белдзяржкіно.

Не пасьпеўшым прайсьці перарэгістрацыю рабочых кніжак

праходзяць перарэгістрацыю

ў пункце 2-ГА РАЁНУ МІЛІЦЫІ (рог. вул. Крапоткіна і Мепраўскай)

да 14 сьнежня ўключна.

Праўленьне МІРК.

Таварыства эканамістаў-марксыстаў і інстытут эканамічных даследаў

склікаюць аб'яднаўчае пасяджэньне таварыстваў і інстытуту на 15-га сьнежня ў 6 1/2 гадз. веч. у памяшк. Дзяржпляну (пляц Волі, № 5, 2-гі паверх, вазя пасяджэньняў).

У парадку дня: даклад т. РАСІНА

«Аб буржуазных скажэньнях у плянаваньні народнай гаспадаркі БССР».

Запрашаюцца прадстаўнікі Дзяржпляну і плянавых ячэек ведамстваў, гаспадарнікі-эканамісты, навуковыя працаўнікі, асьпіранты і студэнты-эканамісты.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт

даводзіць да ведама ўсіх жадаючых паступіць у БДУ, што прыём заяў на зімовы набор гэтага акадэмічнага году працягнут па ўсіх факультэтах да 25-га сьнежня г. г.

КАЛОДЗІШЧАНСКІ С-САВЕТ, Астрош.-Гарад. р-ну

ПРАДАЕ 4 НОВЫЯ ДАМЫ

8х16, крытыя чарапіцай і гонтамі.

Дамы знаходзяцца на адлегласьці 15 клм. ад Менску. КОШТ КОЖНАГА ДОМУ ДА 1.000 РУБ.

За даведкамі зьвяртацца: ст. Калодзішча, с-саве т.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ПАДПІШЭЦЦЕСЯ на 1931 год

на штомесячную літаратурна-мастацкую і грамадзка-палітычную часопісь

„МАЛАДНЯК"

орган Беларускай Асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў

«МАЛАДНЯК» зьяўляецца баявой часопісьсю ў барацьбе за пралетарскую літаратуру, нацыянальную па форме і пралетарскую па зьмесьце.

IX год выд.

«МАЛАДНЯК» мае мэтай даць чытачу мастацкія творы, якія адбівалі-б эпоху вялікага сацыялістычнага будаўніцтва

„МАЛАДНЯК" на сваіх старонках будзе і надалей рашуча праводзіць цьвёрдую бальшавіцкую лінію ў галіне літаратуры, рашуча змагацца з усякімі хістаньнямі, ухіламі, шкодніцкімі тэндэнцыямі і варожымі ўхіламі ў літаратуры і змагацца за баявое згуртаваньне радоў беларускай пралетарскай літаратуры.

„МАЛАДНЯК" у 1931 г. зьмесьціць рад артыкулаў па пытаньнях пралетарскага мастацтва і творчых дасягненьняў беларускай пралетарскай культуры, а таксама літаратуры братніх рэспублік.

Лепшыя сілы пралетарскай літаратуры і марксыцкай крытыкі ўдзельнічаюць у „МАЛАДНЯКУ"

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На 1 год. 5 руб. На 6 мес. 3 руб. На 3 мес. 1 р. 50 к. Асобны нум. 50 коп.

Падпіска прымаецца: у аддзеле падпісных і перыядычных выданьняў БДВ, Менск, Савецкая, 79, кіёскамі, кнігарнямі і ўпаўнаважнымі БДВ, ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і крамах спажывецкай кааперацыі

Аддзел падпісных і перыядычных выданьняў.

Вячэрні рабочы унівэрсытэт.

Даводзіцца да ведама студ. вяч. раб. ун-ту, якія працуюць на прадпрыемствах на вячэрняй зьмене, што ВЯЧЭРНІ РАБОЧЫ УНІВЭРСЫТЭТ ПЕРАВОДЗІЦЬ СВАЕ ЗАНЯТКІ на дзьве зьмены: ДЗЕННУЮ І ВЯЧЭРНЮЮ.

Вячэрняя зьмена будзе працаваць паводле старога раскладу, а дзённая будзе працаваць у наступныя дні: 2, 4, 7, 9, 12, 14, 17, 19, 22, 24, 27 і 29 кожнага месяца ад 10 да 2-х г. дня ў фізычным інстытуце БДУ (Зямляробскі зав., № 4). Першыя заняткі адбудуцца 12-га сьнежня ў 10 гадз. дня.

Беларускі хэміка-тэхналёгічны інстытут

— паведамляе, што —

студэнскі набор адтэрмінован.

Аб часе прыёму і пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна праз друк.

Да ведама ўсіх аграрнікаў-марксыстаў,

Сход аграрнікаў-марксыстаў,

назначаны на АДЫДЗЕЦЦА 10 сьнежня СЕНЬНЯ 12 сьнежня ў 5 з пал. гадз. веч., у пам. інстытуту сап. рэканструкцыі (Шырокая, 28).

Запрашаюцца ўсе т. т. аграрнікі-марксысты г. Менску.

Парадак дня: кандрацьцеўшчына ў БССР (працяг).

13-га сьнежня ў 7 гадз. веч. у залі пасяджэньняў ЦСПСБ, пак. № 10

САЦ.-БЫТ. СЭКТАР ЦСПСБ

склікае

ШЫРОКУЮ НАРАДУ па пытаньні аб рабоце самадзейных сталовак (жакатаўскіх)

з дакладам гаржыласаюзу і судакладам рабочай брыгады. Павінны зьявіцца: зав. сац.-быт. сэктарамі ЦП саюзаў, старшыні праўленьняў ЖАКТ'аў, заг. жакатаўскімі сталоўкамі, прадстаўнікі РСІ, БКС, Белмяса